
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года **№ 30 (518)** **25 ЛІПЕНЯ 2001 г.**

Адзіны кандыдат ад наменклатурных дэмакратаў





21-га ліпеня нарада пяці так званых дэмакратычных прэтэндэнтаў (У. Ганчарык, С. Домаш, П. Казлоўскі, С. Калякін і М. Чыгір) вызначыла адзінага кандыдата ад дэмакратычнай апазіцыі для ўдзелу у прэзідэнцкіх выбарах. Было названа імя старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай Уладзіміра Ганчарыка. Не былі ўзяты пад увагу ніякія аргументы, а па ўсіх параметрах перавагу меў Сямён Домаш. Сямён Домаш пагадзіўся з вызначэннем, але, як высветлілася праз некалькі гадзін "пяцёрка" не мела права прымаць такое рашэнне, бо яна проста ўжо не існавала.

21 ліпеня старшыня Цэнтрвыбаркаму Лідзія Ярмошына паведаміла БелаПАН, што, "згодна з папярэднімі звесткамі ЦВК, толькі чацвёра прэтэндэнтаў здалі больш за 100 тысяч подпісаў. Гэта - дзейны прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, лідэр Федэрацыі прафсаюзаў Беларускай Уладзімір Ганчарык, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргей Гайдукевіч і лідар незарэгістраванага руху "Рэгіянальная Беларусь" Сямён Домаш".

Далей паводле ж слоў Лідзіі Ярмошынай, "у падтрымку Марыніча было здадзена каля 100 тысяч подпісаў, і ён разам са старшынёй Партыі камуністаў Беларускай Сяргеем Калякіным і генеральным дырэктарам ЗАТ "Атлант" Леанідам Калугіным знаходзіцца "у пагранічным стане".

Таму ні Чыгір, ні Казлоўскі, ні Калякін, як не сабраўшыя подпісы, не мелі права вызначаць адзінага кандыдата.

Пасля таго, як гэта стала вядома, рэгіянальныя арганізацыі БНФ "Адраджэньне", БСДП "Народная грамада", АГП, арганізацыі трэцяга сектару прыступілі да падрыхтоўкі правядзеня абласных канферэнцый і радаў партый і рухаў, а, таксама, асамблей і рабочых групаў няўрадавых арганізацый з задачай вынясення рашэнняў гэтых арганізацый аб прадаўжэнні выбарчай кампаніі Сямёнам Домашам, як адзіным прэтэндэнтам, які карыстаецца падтрымкай шырокіх дэмакратычных колаў.



! ці ад дэмакратычнай Беларусі

Дарагія сябры "Нашага слова"!

Сёння мы паведамляем вам вынікі падпісной кампаніі на трэці квартал 2001 года. У гэтым квартале намаганнямі Сакратарыяту ТБМ, а таксама сяброў ТБМ у розных рэгіёнах краіны падпіска на нашу газету значна вырасла. Мы маем на сёння 3855 тысяч падпісчыкаў. Падпіскай на газету "Наша слова" закрыты большасць раёнаў Беларусі. Падпісана каля 2600 вясковых бібліятэк. Падпісана вялікая колькасць менскіх бібліятэк. Падпісаны ўсе вышэйшыя і шэраг сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў краіны. Сакратарыят нагадвае, што ўсе, хто хоча атрымаць падпіску на свае бібліятэкі, школы, дзіцячыя садкі на чацвёрты квартал, мусяць прыслаць падпісныя карткі ў Менск на Румянцава, 13.

	Красавік			Ліпень		
	Інд.	Вед.	Разам.	Інд.	Вед.	Разам.
Берасцейская вобласць:						
Баранавічы р.в	25	13	38	16	14	30
Бяроза р.в.	8	4	12	2	28	30
Белаазёрск р.в	2	1	1	2	-	2
Бярэсце гор.	18	2	20	19	35	54
Ганцавічы р.в.	2	5	7	3	21	24
Драгічын р.в.	2	1	3	1	38	39
Жабінка р.в.	2	18	20	-	19	19
Іванава р.в.	1	1	2	-	35	35
Івацэвічы р.в	1	18	19	3	44	47
Камянец р.в.	23	49	72	-	49	49
Кобрын гор.	14	28	42	2	29	31
Лунінец гор.	4	1	5	2	35	37
Ляхавічы р.в.	1	1	2	2	26	28
Маларыта р.в.	2	1	3	1	5	6
Пінск гор.	39	63	102	25	49	74
Пружаны р.в.	8	1	9	5	43	48
Столін р.в.	2	1	3	2	51	53
Усяго:	**151**	**210**	**361**	**86**	**520**	**606**
Віцебская вобласць:						
Бешанковічы р.в.	2	18	20	3	18	21
Браслаў р.в.	2	1	3	1	21	22
Віцебск гор.	27	1	28	24	23	47
Віцебск РВПС	-	1	1	3	7	10
Верхнедзвінск р.в.	6	1	7	3	1	4
Глыбокае р.в.	7	1	8	4	32	36
Гарадок р.в.	1	1	2	1	1	2
Докшыцы р.в.	1	1	2	1	1	2
Дуброўня р.в.	1	1	2	2	1	3
Круляўшчызна	3	-	3	3	-	3
Ліёзна р.в.	21	1	22	4	-	4
Лепель р.в.	1	1	2	-	1	1
Міёры р.в.	19	-	19	14	-	14
Наваполацк гор.	40	–	40	59	1	60
Ворша гор.	8	22	30	8	14	22
Полацк гор.	72	13	85	51	28	79
Паставы р.в.	4	2	6	4	-	4
Расоны р.в.	1	15	16	-	-	-
Сянно р.в.	1	1	2	-	1	1
Талочын р.в.	2	2	4	1	1	2
Ушачы р.в.	2	9	11	1	23	24
Чашнікі р.в.	2	1	3	1	1	2
Шаркоўшчына р.в.	9	1	10	9	2	11
Шуміліна р.в.	3	1	4	10	7	17
Усяго:	**236**	**94**	**330**	**207**	**184**	**391**
Менская вобласць:						
Беразіно р.в.	4	1	5	3	1	4
Барысаў гор.	8	39	47	6	41	47
Вілейка гор.	6	41	47	4	-	4
Валожын гор.	11	28	39	10	28	38
Дзяржынск р.в.	1	27	28	-	-	-
Жодзіна гор.	7	1	8	6	10	16
Клецк р.в.	2	42	44	2	42	44
Крупкі р.в.	1	1	2	-	-	-
Капыль р.в.	4	32	36	2	32	34
Лагойск р.в.	2	33	35	2	33	35
Любань р.в.	4	33	37	6	33	39
Менск гор.	455	-	455	359	72	431
Менск РВПС	12	54	66	3	73	76
Маладэчна гор.	18	68	86	19	41	60
Мядзель р.в.	12	2	14	12	2	14
Пухавічы РВПС	16	45	61	12	-	12
Нясвіж р.в.	4	15	19	3	16	19
Смалявічы р.в.	1	1	2	-	-	-
Слуцк гор.	11	38	49	9	38	47
Салігорск гор.	11	33	44	5	34	39
Ст. Дарогі р.в.	-	19	19	-	20	20
Стоўбцы р.в.	15	46	61	5	47	52
Узда р.в.	2	20	22	1	20	21
Чэрвень р.в.	7	1	8	5	32	37
Фаніпаль	1	-	1	1	-	1
Усяго:	**615**	**620**	**1235**	**485**	**605**	**1090**

	Красавік			Ліпень		
	Інд.	Вед.	Разам.	Інд.	Вед.	Разам.
Гомельская вобласць:						
Буда-Кашалёва	3	2	5	6	47	53
Брагін р.в.	1	2	3	-	4	4
Ветка р.в.	1	-	1	3	30	33
Гомель гор.	43	13	56	45	21	66
Гомель РВПС	1	-	1	1	36	37
Добруш р.в.	1	2	3	2	35	37
Ельск р.в.	1	1	2	4	3	7
Жыткавічы р.в.	46	-	46	11	59	70
Жлобін гор.	5	42	47	30	29	59
Калінкавічы гор.	1	45	46	2	9	11
Карма р.в.	1	1	2	3	19	22
Лельчыцы р.в.	23	19	42	6	20	26
Лоеў р.в.	1	1	2	-	22	22
Мазыр гор.	13	22	35	11	24	35
Акцябарскі р.в.	2	-	2	-	20	20
Нароўля р.в.	1	1	2	1	1	2
Петрыкаў р.в.	2	47	49	5	48	53
Рэчыца гор.	3	28	31	3	29	32
Рагачоў гор.	3	2	5	1	43	44
Светлагорск гор.	4	35	39	5	36	41
Хойнікі р.в.	1	3	4	4	4	8
Чачэрск р.в.	1	8	9	2	25	27
Усяго:	**159**	**273**	**432**	**145**	**564**	**709**
Гарадзенская вобласць:						
Бераставіца	3	1	4	-	22	22
Ваўкавыск гор.	15	2	17	11	30	41
Воранава р.в.	3	18	21	8	32	40
Горадня гор.	117	3	120	75	3	78
Горадня РВПС	11	54	65	31	60	91
Дзятлава р.в.	6	24	30	3	36	39
Зэльва р.в.	8	1	9	4	25	29
Іўе р.в.	27	19	46	3	32	35
Карэлічы р.в.	4	1	5	4	27	31
Масты р.в.	12	25	37	9	27	36
Навагрудак гор.	9	57	66	10	55	65
Астравец р.в.	3	1	4	3	27	30
Ашмяны р.в.	32	19	51	16	30	46
Смаргонь гор.	13	18	31	8	32	40
Слонім гор.	86	10	96	10	24	34
Свіслач р.в.	3	1	4	4	25	29
Шчучын р.в.ю	6	18	24	4	44	48
Ліда	35	120	155	25	59	84
Усяго:	**403**	**382**	**785**	**228**	**590**	**818**
Магілёўская вобласць:						
Бабруйск гор.	27	-	27	19	1	20
Бабруйск РВПС	-	26	26	-	12	12
Бялынічы р.в	6	1	7	2	1	3
Быхаў р.в.	2	1	3	2	1	3
Глуск р.в.	1	1	2	2	1	3
Горкі гор.	25	29	54	21	31	52
Дрыбін р.в	1	1	2	-	1	1
Кіраўск р.в.	1	1	2	-	1	1
Клічаў р.в.	1	1	2	-	1	1
Краскаполле р.в.	1	1	2	-	1	1
Крычаў р.в.	1	1	2	-	1	1
Клімавічы р.в.	3	18	21	3	-	3
Касцюковічы р.в.	2	25	27	1	15	16
Круглае р.в.	4	2	6	4	-	4
Мсціслаў р.в.	5	24	29	-	-	-
Магілёў гор.	23	1	24	21	19	40
Магілёў РВПС	-	38	38	1	-	1
Асіповічы гор.	11	35	46	7	35	42
Слаўгарад р.в.	1	1	2	1	-	1
Хоцімск р.в.	1	1	2	-	-	-
Чэрыкаў р.в.	3	1	4	13	7	20
Чавусы р.в.	2	1	3	-	-	-
Шклоў р.в.	6	1	7	3	15	18
Усяго:	**127**	**211**	**338**	**100**	**143**	**243**
Усяго па краіне:	**1701**	**1780**	**3481**	**1251**	**2604**	**3855**

Інтэрвію для "Нашага слова"

У "Нашым слове" за 11 ліпеня надрукаваныя пытанні інтэрвію з прэтэндэнтамі ў кандыдаты на выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пра стаўленне прэтэндэнтаў да праблем беларускай мовы.

1. У якой ступені Вы валодаеце дзяржаўнай беларускай мовай, як часта размаўляеце на ёй у сям'і, афіцыйных абставінах, ці ўжываеце вы яе у афіцыйнай і неафіцыйнай перапісцы і іншых камунікацыйных зносінах?

2. Ці лічыце Вы неабходным усталяванне рэальнага статусу беларускай мовы як афіцыйнай дзяржаўнай і якія маеце прапановы па рэалізацыі гэтага?

3. Ці лічыце Вы неабходным наданне дзяржаўнага статусу спрадвечным нацыянальным сімвалам – гербу "Пагоня" і бел-чырвона-беламу сцягу і якія маеце прапановы па рэалізацыі гэтага?

4. Ці лічыце Вы неабходным стварэнне ў Беларусі сістэмы вышэйшай адукацыі на беларускай мове і адкрыццё Беларускага нацыянальнага універсітэта (улічваючы сабраныя ТБМ больш за 50 тысяч подпісаў за БНУ) і якія будуць прапановы па вырашэнні гэтага?

У мінулым нумары мы друкавалі думкі пра беларускую мову Аляксандра Ярашука. Сёння друкуем адказыМіхаіла Марыніча і Міхаіла Чыгіра.

Міхаіл Марыніч даслаў свае адказы пісьмова.



1.Роднай мовай, канешне ж валодаю, але шчыра прызнаюся, што размаўляць на ёй даводзіцца рэдка, у большасці з блізкімі сябрамі з ліку творчай інтэлігенцыі. Што ж да выкарыстання беларускай мовы ў афіцыйных зносінах, то тут не толькі ніхто не размаўляе па-беларуску, а ўсе мы пастаўлены ў такія ўмовы, калі ўжыванне беларускай мовы адназначна расцэньваецца, як прыналежнасць да апазіцыі. Такім чынам, родная мова выкарыстоўваецца ўладамі, як інструмент для расколу грамадства.

2. Так, лічу і буду рабіць усё магчымае дзеля таго, каб усталяваць рэальны статус беларускай мовы, як дзяржаўнай. Гэта, на мой погляд, трэба рабіць праз прыняцце пэўнага заканадаўства і выкананне дзейнага, якім ужо сёння прадугледжана валоданне беларускай мовай службовымі асобамі ўсіх рангаў.

3. Нацыянальныя сімвалы герб "Пагоня" і белчырвона-белы сцяг сапраўды спрадвечныя. Хто толькі не здзекаваўся над імі ў нашай даўняй і блізкай гісторыі і якія толькі знявагі ў адрас гэтай гістарычнай спадчыны не прыйшлося нам выслухоўваць ад цяперашняга павадыра. Але ж народная памяць мацней за ўсю гэтую насланнь. І ячшэ адно скажу. Гэтыя сімвалы вечныя, бачыце колькі мінуўшчыны перажылі, а тыя, хто імкнуўся зневажаць іх – пачасоўшчыкі.

4. Што тычыцца сістэмы вышэйшай адукацыі ў краіне, то тут наўрад ці правамоцна ставіць пытанне аб старэнні нейкай паралельнай сістэмы з беларускай мовай навучання. Адукацыя ў нас павінна быць нацыянальнай па сваёй сутнасці і па зместу. І ў гэтым напрамку нам трэба вельмі многа працаваць. Разам з тым лічу, што ў школах і ВНУ краіны больш сур'ёзна павінны ставіцца да вывучэння замежных моў (англійскай, нямецкай, французскай і іншых). Своеасаблівы моўны прарыў дазволіць нам упэўнена і ў найкарацейшыя тэрміны авалодаць сусветным досведам.

Марыніч М.А.
13.07.01.

Міхаіл Чыгір даў адказ вусна карэспандэнту радыё "Свабода" Валянціне Аксак.

Аксак: "Спадар Чыгір, у якой ступені Вы валодаеце дзяржаўнай беларускай моваю, як часта размаўляеце на ёй у сям'і, у афіцыйных абставінах і іншых камунікацыйных зносінах?"

Чыгір: "У тым выпадку, калі хто па-беларуску да мяне звяртаецца. Гэта асноўнае правіла. Дома, на жаль, не вельмі часта. Бывае, калі яшчэ нехта з'яўляецца ў нас, то тады ўсёй сям'ёй разам гаворым па-беларуску. А ці валодаю я беларускай мовай, то высновы няхай робіць той, хто мяне слухае".

Аксак: "Ці лічыце Вы неабходным усталяванне рэальнага статусу беларускай мовы, як дзяржаўнай, і якія маеце прапановы па рэалізацыі гэтага?"

Чыгыр: "Я ўпэўнены ў тым, што нейкія рэзкія павароты з беларускай мовай рабіць нельга. Усё-такі нашае насельніцтва прывыкла да расейскай мовы і прывыкла вельмі моцна. Таму я лічу, што, каб беларуская мова ў нас запанавала, трэба стымуляваць ейны ўжытак. Дзеля чаго павінна быць дзяржаўная праграма і павінна быць дзяржаўнае фінансаванне. І тады, з часам, беларуская мова стане дзяржаўнаю моваю. Абвяшчаць яе такой з заўтрашняга дня не трэба. Але наогул, з часам, гэта павінна быць зроблена".

Аксак: "А ці лічыце Вы неабходным наданне дзяржаўнага статусу спрадвечным нацыянальным сімвалам — гербу "Пагоня" і бел-чырвона-беламу сцягу і што для гэтага лічыце патрэбным рабіць?"

Чыгір: "У той час, калі адбывалася замена нашых нацыянальных сімвалаў на цяперашнія, я быў вялікім супраціўнікам усяго таго, што адбылося. Але цяпер мушу сказаць: не адзін чалавек павінен гэта вырашаць. Якім быць нацыянальным сімвалам, павінен вырашыць парламент, свабодна і дэмакратычна абраны. Ну а ў душы я згодзен з тым, што ўсё-ткі на гэтай зямлі даўжэй былі тыя сімвалы, якія былі дзяржаўнымі да цяперашніх. І яны павінны зноў стаць дзяржаўнымі, але, паўтараю, гэта павінен вырашаць парламент".

Аксак: "Ці падтрымліваеце вы прапанову ТБМ пра стварэнне ў краіне нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі?"



Чыгір: "Так, я падтрымліваю гэтую прапанову".

Аксак: "І апошняе пытанне, спадар Чыгір. Як часта Вы паслугоўваецеся беларускай мовай у цяперашняй перадвыбарчай кампаніі?"

Чыгір: "Скажу адкрыта — не часта. Таму што людзі, якія збіраюцца на сустрэчы, у бальшыні сваёй не становіча рэагуюць на беларускую мову выступоўцаў. Таму, як я ўжо казаў, калі хто звяртаецца да мяне па-беларуску, то і я адказваю яму па-беларуску. Але, калі збіраецца на сустрэчы чалавек 20-30, то я размаўляю з імі па-расейску".

Справаздача выдавецкай камісіі ТБМ за перыяд 2000 – травень 2001 г.

За акрэслены перыяд выдавецкая камісія у рамках рэалізацыі плану працы на 2000 г., зацверджаным на паседжанні Рэспубліканскай Рады ТБМ, ажыццявіла наступныя праекты:

1) Наладзіла сталае супрацоўніцтва з шэрагам дзяржаўных выдавецтваў: "Юнацтва", "Мастацкая літаратура", "Беларусь", "Полымя", "Ураджай", "Беларуская энцыклапедыя", а таксама недзяржаўнымі: "Беларускі кнігазбор", "Бел-літфонд", "Энцыклапедыкс", "БГА", "Тэхналогія".

Вынікам гэтага супрацоўніцтва стала пашырэнне чытацкай аўдыторыі і папулярызацыі беларускай літаратуры, асабліва новых беларускіх кніжак, выпушчаных выдавецтвамі "Беларускі кнігазбор" і "Энцыклапедыкс". Сябрамі выдавецкай камісіі быў наладжаны іхні рэалізацыі правакацыйная ліў(Ад-казныя – Кастусь Дадзькоў і Сяргей Гуркоў.)

2) У рамках забеспячэння беларускіх школаў і бібліятэкаў беларускамоўнай літаратурай была арганізавана бязвыплатная перадача кніжак, часопісаў і газетаў гарадскім і вясковым бібліятэкам, школам і іншым навучальным установам. Сярод перададзенай літаратуры – папулярныя кнігі і часопісы па гісторыі, літаратуры, шэраг дзіцячых кніжак, газета "Наша слова".

3) Праведзена падпісная кампанія на газету "Наша слова" (колькасць падпісчыкаў амаль дасягнула 4.000 чалавек).

4) Сябрам выдавецкай камісіі Гурковым Сяргеем арганізаваная сталая праца выставы беларускіх кніжак, часопісаў, аўдыё- і відэакасетаў на сядзібе ТБМ.

5) Было ўсталявана шчыльнае супрацоўніцтва з Беларускім відэаклубам ТБМ (старшыня – Віталь Станішэўскі) і ЗАТ "Сотвар" у сферы распаўсюду беларускамоўнага відэа.

Выдавецкая камісія Таварыства за час сваёй дзейнасці распрацавала праект шанавальнай граматы ТБМ і дыплом, якім былі ўзнагароджаныя вясковыя школы, што бралі ўдзел у конкурсе "Захаванне нацыянальнай і гістарычнай спадчыны".

Сябра камісіі Сяржук Гуркоў наладзіў пастаянную выставу беларускай кніжнай прадукцыі, у тым ліку выпушчанай з ініцыятывы ТБМ. Падчас падпісной кампаніі сябры камісіі распаўсюджваюць улёткі з мэтай прапаганды беларускамоўных газет і часопісаў, а таксама квіткі на газету "Наша слова", што спрыяе пашырэнню чытацкай аўдыторыі.

Старшыня камісіі
Кастусь Дадзькоў.



ПРАКУРАТУРА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ПРАКУРАТУРА города МИНСКА
220053, г. Минск, ул. Шчадрына, 1
«13» июля 2001 года № 7-100-2001

220005, г. Минск,
ул. Румянцева, 13
Трусову О.

"13" июля 2001 года № 7-100-2001

Прокуратурой города Минска рассмотрено Ваше обращение о несогласии с действиями работников милиции УВД Партизанского района г. Минска 29.05.2001 года.

В ходе проведенной проверки установлено, что 29.05.2001 года работниками УВД Партизанского раёона г. Минска в отношении группы писателей административные протоколы о нарушении административного законодательства не составлялись. Постановления о привлечении указаных лиц к ответственности не выносилось, в связи с чем, оснований для принятия мер прокурорского реагирования не имеется.

Начальник отдела общего надзора Прокуратуры города Минска
Советник юстиции А. Г. Суховерко



МІНІСТЭРСТВА УНУТРАНЫХ СПРАЎ Рэспублікі Беларусь
МИНИСТЕРСТВО ВНУТРЕННИХ ДЕЛ Республики Беларусь
220615, г. Мінск, Гарадскі вал, 2
220615, г. Минск, Городской вал, 2

16.07.2001 г. №21/Т-1

16.07.201 г. № 21/Т-1

Старшыні грамадскага аб'яднання
"Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны"
Трусаву А.А. 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13.

Паважаны Алег Анатолевіч!

Ваш ліст аб парушэнні артыкула 172-2 КаАП Рэспублікі Беларусь участковым інспектарам Партызанскага РУУС г. Мінска Пыжэм Ул. В. разгледжаны

Пры састаўленні адміністрацыйных матэрыялаў на Баршчэўскага Л.П., Скоблу М.Ул. і Хаценка А.Я. супрацоўнік міліцыі карыстаўся рускай мовай, што не супярэчыць артыкулу 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Закону Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь". Вышэйпаказаным асобам карыстацца беларускай мовай не перашкаджалася.

Першы намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі
і спецыяльнай міліцыі І. І. Дубік.

Выніковая табліца здадзеных подпісаў за вылучэнне кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Домаша Сямёна Мікалаевіча, сябра ТБМ, у 1997-1999 гадах сябра Рэспубліканскай Рады ТБМ


Берасцейская вобласць:	
Берасце, Маскоўскі р-н	3980
Берасце, Ленінскі р-н	2272
Баранавічы	3411
Бяроза	2262
Ганцавічы	1186
Драгічын	1158
Жабінка	518
Іванава	368
Івацэвічы	1844
Баранавіцкі р-н	127
Камянец	375
Кобрын	1787
Лунінец	408
Ляхавічы	362
Маларыта	704
Пінск	1359
Пружаны	898
Столін	451
Берасцейскі р-н	151
Усяго:	**23801**
Віцебская вобласць:	
Віцебск,	
Кастрычніцкі р-н	1809
Чыгуначны р-н	329
Першамайскі р-н	2890
Бешанковічы	631
Браслаў	832
Верхнедзвінск	833
Глыбокае	881
Гарадок	544
Докшыцы	-----
Дуброўна	37
Ліёзна	261
Лепель	-----
Міёры	62
Наваполацк	2180
Ворша	3087
Аршанскі р-н	72
Полацк	838
Паставы	1040
Расоны	-----
Сянно	-----
Талочын	1003
Ушачы	248
Чашнікі	1246
Шаркоўшчына	539
Шуміліна	406
Усяго:	**19768**
Менская вобласць:	
Менскі р-н	1724
Беразіно	-----
Барысаў	5370
Вілейка	1637
Валожын	-----
Дзяржынск	695
Жодзіна	2004
Клецк	1022
Крупкі	111
Капыль	-----
Лагойск	288
Любань	-----
Маладэчна	1906
Мядзель	-----
Пухавічы	723
Нясвіж	194
Смалявічы	-----
Слуцк	845
Салігорск	3776
Ст. Дарогі	-----
Стоўбцы	-----
Узда	41
Чэрвень	50
Заслаўе	204
Усяго:	**20590**
Гомельская вобласць:	
Гомель	
Навабеліцкі р-н	1081
Савецкі р-н	3221
Чыгуначны р-н	3068
Цэнтральны р-н	1239
Буда-Кашалёва	811
Брагін	-----
Ветка	-----
Добруш	359
Ельск	-----
Жыткавічы	503
Жлобін	2492
Калінкавічы	890
Карма	-----
Лельчыцы	324
Лоеў	758
Мазыр	2317
Акцябарскі	377
Нароўля	-----
Петрыкаў	177
Рэчыца	1735
Рагачоў	1630
Светлагорск	1934
Хойнікі	-----
Чачэрск	30
Гомельскі р-н	93
Усяго:	**23109**
Гарадзенская вобласць:	
Горадня	
Ленінскі р-н	4896
Кастрычніцкі р-н	5947
Бераставіца	330
Ваўкавыск	1244
Воранава	1663
Гарадзенскі р-н	351
Дзятлава	1291
Зэльва	705
Іўе	-----
Карэлічы	-----
Масты	920
Навагрудак	98
Астравец	452
Ашмяны	898
Смаргонь	1887
Слонім	1918
Слонімскі р-н	217
Свіслач	1501
Шчучын	1213
Ліда	1739
Лідскі р-н	226
Усяго:	**27469**
Магілёўская вобласць:	
Магілёў	
Ленінскі р-н	1980
Цэнтральны р-н	2050
Кастрычніцкі р-н	2999
Бабруйск	
Першамайскі р-н	1664
Ленінскі р-н	1893
Бялынічы	264
Быхаў	-----
Глуск	-----
Горкі	571
Дрыбін	249
Кіраўск	-----
Клічаў	248
Краснаполле	-----
Крычаў	1002
Клімавічы	-----
Касцюковічы	-----
Круглае	-----
Мсціслаў	492
Асіповічы	784
Слаўгарад	160
Хоцімск	-----
Чэрыкаў	-----
Чавусы	251
Шклоў	529
Усяго:	**15151**
Менск:	
Фрунзенскі р-н	4078
Кастрычніцкі р-н	5203
Першамайскі р-н	3837
Ленінскі р-н	4192
Савецкі р-н	2358
Заводскі р-н	3598
Партызанскі р-н	1995
Маскоўскі р-н	3037
Цэнтральны р-н	2264
Усяго:	**30562**
Усяго па краіне:	**160450**

Да 150-годдзя з дня нараджэння Янкі Лучыны

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь
М.І. Дзямчук

ПЛАН
Мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да 150-годдзя
З дня нараджэння паэта Янкі Лучыны
(Івана Люцыянавіча Неслухоўскага)

Найменне мерапрыемстваў	Тэрмін выканання	Адказныя за выкананне
1. Правесці ў г. Менску ўрачысты вечар да 150-годдзя з дня нараджэння Янкі Лучыны	6 ліпень 2001 г.	Мінкультуры, Менскі гарвыканкам, Саюз беларускіх пісьменнікаў
2. Арганізаваць і правесці выставкі, прысвечаныя жыццю і творчасці Янкі Лучыны, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры	чэрвень-ліпень 2001 г.	Мінкультуры
3. Правесці навуковую канферэнцыю "Янка Лучына – прадвеснік Адраджэння"	29 мая 2001 г.	НАН Беларусі Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф.Скарыны, Саюз беларускіх пісьменнікаў
4. Выдаць да юбілею паэта кнігу даследаванняў аб творчасці Янкі Лучыны	II квартал 2001 г.	Дзяржкамдрук НАН Беларусі Саюз беларускіх пісьменнікаў
5. Прысвоіць адной з вуліц у г. Менску імя Янкі Лучыны і ўстанавіць памятную дошку	II квартал 2001 г.	Менскі гарвыканкам
6. Добраўпарадкаваць магілу паэта на Кальварыйскіх могілках у г. Менску і ўстанавіць надмагільны помнік	II квартал 2001 г.	Менскі гарвыканкам Мінкультуры
7. Выпусціць канверт з арыгінальнай маркай і спецштэмпелем, прысвечанымі юбілею паэта	ліпень 2001 г.	Мінсувязі
8. Арганізаваць і правесці ў навучальных установах Беларусі 1 верасня 2001 г. урокі, прысвечаныя Янку Лучыне, а таксама ўрачыстыя вечары, тэматычныя лекцыі, канферэнцыі чытачоў, сустрэчы з дзеячамі беларускай культуры і мастацтва, пісьменнікамі	на працягу 2001 г.	Мінадукацыя
9. Зняць і выпусціць відэафільм, прысвечаны паэту	I-II квартал 2001 г.	Мінкультуры
10. Арганізаваць на тэлебачанні цыкл перадач, прысвечаных жыццю і творчасці Янкі Лучыны	на працягу 2001 года	Белтэлерадыёкампанія



Маркаваны канверт да 150-годдзя з дня нараджэння Янкі Лучыны, выпушчаны Міністэрствам сувязі ініцыятыве ТБМ

Навучанне літаратараў-пачаткоўцаў

Сярод моладзі Гарадоцкага раёна ёсць даволі многа асоб, якія робяць першыя спробы пяра, ствараючы свае вершы, апавяданні, гумарэскі і г.д. За апошнія гады творы нашых аўтараў з'явіліся на старонках раённай і рэспубліканскіх газет, прагучалі ў некалькіх перадачах Міколы Чарняўскага на беларускім радыё ў праграме "Першыя сцяжынкі". З 1999 года дзейнічае моладзевы літаратурны клуб "Парнас", у межах якога праводзяцца сустрэчы з беларускімі паэтамі, празаікамі. Юныя таленты ёсць у многіх школах, вёсках і неабходна дапамагаць ім у набыцці вопыта літаратурнай дзейнасці. З гэтай мэтай быў праведзены летнік "Асновы літаратурнай творчасці". Першыя заняткі правёў старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў Франц Сіўко. Франц Іванавіч пазнаёміў слухачоў з асновамі літаратурнай дзейнасці, прывёў жыццёвыя прыклады аб стварэнні твораў, адказаў на пытанні юных літаратараў.

Прадстаўнікі школ з Вайхан, Бычыхі, Езярышча, Обалі, з СШ №1, СШ №2, Гарадоцкай базавай прачыталі свае лепшыя творы, апавядалі аб сваім літаратурным дэбюце. Настаўнікі роднага слова Андрэева Л.С., Крыжэўская М.М., Маранава Т.У., Ляўшова Л.П. і іншыя паведамленні аб працы з творчай моладдзю.

Упланах працы з творчай моладдзю: выданне літаратурнага зборніка "Пошукі Парнаса", удзел у краязнаўчай віктарыне па тарасазнаўству.

Леанід Гаравы.

СВЯТА МАЛАДЫХ ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ

На працягу 2000-2001 гг. менскае грамадскае аб'яднанне "Дыярыюш" з падтрымкай ТБМ, ТБШ, ЗБШ, Беларускай музычнай альтэрнатывы, газет "Рабочы", " Наша Ніва" ды іншых грамадскіх арганізацый праводзілі ўсебеларускі даследчыцкі конкурс школьнікаў "Мой радавод. Лёс сям'і ў XX ст". Мэтай конкурсу было абуджэнне ў падлеткаў цікавасці да гісторыі сваіх продкаў, праз якую можна лепш зразумець і гісторыю краіны, і сваё месца на гэтай зямлі.

Упершыню такія конкурсы пачалі праводзіцца гадоў 30 таму ў Заходняй Нямеччыне. На Беларусі даследаванне гісторыі продкаў школьнікі рабілі ў 1994-96 гг. ("Зямля пад белымі крыламі"), у 1998-99 гг. ("Блізкая гісторыя. Паўсядзённае жыццё ў Беларусі ў 1945-65 гг."). І вельмі цешыць тое, што з кожным годам цікавасць моладзі да блізкай мінуўшчыны расце: для ўдзелу ў апошнім конкурсе даслалі свае працы 390 чалавек. Так што журы, у склад каторага ўваходзілі вядомыя беларускія гісторыкі, літаратары, культуролагі В. Скалабан, І. Кузняцоў, В. Арэшка, А. Трусаў, Л. Андросік, Л. Баршчэўскі, У. Арлоў, З. Шыбека, павінны былі выбіраць пераможцаў з вялікай колькасці вельмі цікавых і добрых прац.

45 аўтараў лепшых даследаванняў гісторыі свайго роду былі запрошаны 8 ліпеня ў Менск для падвядзення вынікаў конкурсу і ўзнагароджання пераможцаў. Дзякуючы вялікай арганізатарскай працы Ірыны Коваль, як адказнага сакратара конкурсу, і майстэрству Сяргея Сахарава, як вядоўца вечарыны, узнагароджанне пераможцаў ператварылася ў вельмі ўрачыстую і радасную імпрэзу. Дыпломы трэцяй ступені ўручаў Л. Баршчэўскі, другой – В. Канецкі. Уладальнікаў дыпломаў першай ступені вітала Л. Андросік. Акрамя таго, запрошаныя на свята прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў іншых краін, якія таксама займаюцца правядзеннем гістарычных конкурсаў для моладзі, запрасілі па 2 чалавекі з ліку пераможцаў на адпачынак у летнія лагеры ў Польшчы, Нямеччыне, Расеі.

Святочны настрой удзельнікаў, якія атрымалі і дыпломы, і каштоўныя падарункі, яшчэ падвысіўся, калі ў зале клуба "Pall Mall", дзе праводзілася вечарына, для іх пачаў граць вядомы гурт "Палац". Танчыць пайшлі і маладыя пераможцы, і больш сталыя куратары іхніх прац.

Ніна Кануннікава.



№ 30 (518) 25 ЛІПЕНЯ 2001 г. Наша слова

Усё яе жыццё аддадзена даследванню пытанняў роднай мовы

27 ліпеня 2001 года спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэння вядомага вучонага-мовазнаўцы, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР і лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, члена-карэспандэнта Нацыянальнай АН Беларусі, доктара філалагічных навук Юзэфы Фларыянаўны Мацкевіч.

Ю. Ф. Мацкевіч нарадзілася ў 1911 г. у вёсцы Ухлё Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. У дзесяцігадовым узросце засталася сіратой. Старэйшы брат забраў дзяўчынку да сябе ў г. Шклоў, дапамог ёй скончыць сямігодку і Магілёўскі педагагічны тэхнікум (1931 г.). Атрымаўшы дыплом настаўніцы пачатковых класаў, Ю. Ф. Мацкевіч два гады працуе ў школе ў в. Гулькі Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Аднак вялікая прага да ведаў, імкненне да адкрыцця новага, нязведанага прыводзіць маладую настаўніцу ў студэнцкую аўдыторыю. Спачатку Ю. Ф. Мацкевіч займаецца на аднагадовых падрыхтоўчых курсах у Магілёве для паступлення ў ВНУ (1933 – 1934 гг.). Адразу ж пасля гэтага паступае вучыцца ў Менскі педагагічны інстытут на філалагічны факультэт, які заканчвае ў 1938 г. Затым па рэкамендацыі прафесара К. І. Гурскага Юзэфа Фларыянаўна Мацкевіч паступае ў аспірантуру пры Інстытуце мовы і літаратуры Акадэміі навук БССР, спецыялізуецца пад кіраўніцтвам прафесара (пасля члена-карэспандэнта АН СССР) Я. С. Істрынай (Ленінград) па гісторыі беларускай мовы.

Вялікая Айчынная вайна перапыніла паспяхова пачатую навуковую дзейнасць даследчыцы. Гады нямецка-фашысцкай акупацыі роднай Беларусі Ю.Ф. Мацкевіч з дзвюма маленькімі дочкамі перажыла ў в. Слабада Смалявіцкага раёна. Яна ўнесла свой пасільны ўклад у барацьбу з фашысцкімі захопнікамі: была сувязной партызанскай брыгады "Смерць фашызму". Муж Юзэфы Фларыянаўны, Кірыл Мацкеевіч Ганчароў, які да вайны падаваў надзеі літаратуразнаўца і даследчыка беларускай літаратуры і таксама займаўся ў аспірантуры, загінуў на палях бітвы ў вайну.

Галоўнай задачай, якая стаяла перад мовазнаўцамі Беларусі ў пасляваенныя гады, было ўкладанне нарматыўнага Руска-беларускага слоўніка (1953). Ю.Ф. Мацкевіч з энтузіязмам уключаецца ў гэту складаную і адказную справу. У гэты ж час яна завяршае падрыхтоўку сваёй кандыдацкай дысертацыі "Літоўскі статут 1529 года як помнік беларускай літаратурнай мовы ХУ – пачатку ХУІ стагоддзя", якую абараніла ў 1946 г.

Сапраўдным жа жыццёвым прызваннем Юзэфы Фларыянаўны Мацкевіч, галоўным аб'ектам яе навуковых інтарэсаў неўзабаве стала беларуская дыялекталогія. Дыялекталагічная праца ў Беларусі пачала разгортвацца з 1946 г. У Акадэміі навук было вырашана пачаць арганізацыю і падрыхтоўку мовазнаўцаў і выкладчыкаў ВНУ рэспублікі для шырокага даследавання беларускіх гаворак, перш за ўсё для адраджэння і далейшага развіцця беларускай лінгвагеаграфіі – вядучай галіны дыялекталогіі беларускай мовы. У ліку першачарговых задач было запланавана стварэнне Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы.

З самага пачатку разгортвання работы па складанні карт атласа за гэту новую справу ўзялася Ю. Ф. Мацкевіч з энергіяй і характэрнай для яе самаадданасцю. Яна прымае актыўны ўдзел у наладжванні сувязяў з расійскімі і украінскімі дыялектолагамі, прыцягвае і спецыяльна рыхтуе да працы па збіранні матэрыялаў выкладчыкаў мовы, аспірантаў, а таксама шырокае кола студэнтаў, прымае ўдзел у складанні метадычных дапаможнікаў для дыялекталагічнай работы, шмат часу праводзіць у экспедыцыях.

З 1950 па 1986 г. Ю. Ф. Мацкевіч кіруе сектарам дыялекталогіі Інстытута мовазнаўства АН Беларусі і практычна становіцца на чале ўсёй дыялекталагічнай работы, што вядзецца ў рэспубліцы.

"Дыялекталагічны атлас беларускай мовы" (у дзвюх кнігах: 1963 г.) – капітальная праца, буйнейшае навуковае здзяйсненне беларускіх дыялектолагаў у пасляваенны час. Гэта калектыўная праца выканана так паспяхова і ў даволі сціслыя тэрміны ў значнай ступені дзякуючы арганізатарскім здольнасцям, намаганням і самаму вялікаму творчаму ўкладу Юзэфы Фларыянаўны Мацкевіч.

Арганічным працягам і папярэднім абагульненнем даных атласа і частковай гісторыка-лінгвістычнай інтэрпрэтацыяй іх з'яўляецца калектыўная праца ў дзвюх кнігах – "Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак" (1968-1969гг.), падрыхтаваная па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН СССР Р.І.Аванесава і члена-карэспандэнта АН БССР Ю.Ф.Мацкевіч.

Юзэфа Фларыянаўна Мацкевіч з'яўляецца таксама сааўтарам такіх фундаментальных мовазнаўчых прац, як "Нарысы па гісторыі беларускай мовы" (1957 г.), "Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Марфалогія" (1957 г.), "Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі" (1962 г.), "Нарысы па беларускай дыялекталогіі" (1964 г.), "Мікратапанімія Беларусі" (1974 г.).

За комплекс прац па беларускай дыялекталогіі (куды ўвайшлі: "Дыялекталагічны атлас беларускай мовы" у дзвюх кнігах, двухтомная праца "Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак" і "Нарысы па беларускай дыялекталогіі") Ю.Ф.Мацкевіч разам з іншымі вучонымі-мовазнаўцамі ў 1971 годзе была ўганаравана Дзяржаўнай прэміяй СССР.

Ю.Ф.Мацкевіч напісала капітальнае даследаванне – манаграфію "Марфалогія дзеяслова ў беларускай мове" (1959 г.). Гэта праца з'яўляецца першай у беларускім мовазнаўстве спробай манаграфічнага апісання сістэмы дзеяслова з усёй складанасцю яго катэгорый і форм на базе дыялектных дадзеных беларускіх гаворак другой палавіны 40-х – 50-х гадоў ХХ стагоддзя і мовы мастацкай літаратуры канца ХІХ – пачатку 50-х гадоў ХХ стагоддзя. У рабоце даецца падрабязны аналіз спосабаў утварэння граматычных катэгорый і форм спражэння, апісваюцца марфалагічныя варыянты асабовых флексій у беларускіх гаворках і іх адлюстраванне ў мове мастацкай літаратуры, аналізуюцца формы інфінітыва. Гэта кніга з'явілася асновай доктарскай дысертацыі Юзэфы Фларыянаўны, якую яна абараніла ў 1963 г.

У 1970-ыя – першай палове 1980-ых гадоў у сектары дыялекталогіі пад кіраўніцтвам Ю. Ф. Мацкевіч быў падрыхтаваны і выйшаў у свет пяцітомны "Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе паграніччa" (1979-1986 гг.). Навізна гэтага слоўніка ў тым, што ў параўнанні з усімі папярэднімі ў ім упершыню прадстаўлена лексіка буйной тэрытарыяльнай адзінкі – дыялектнай зоны, што вылучаецца на падставе этналінгвістычных дадзеных і абумоўлена прычынамі культурна-гістарычнага парадку. У слоўніку пададзены вялікі лексічны і фразеалагічны матэрыял жывой народнай мовы, які стаў надзейнай базай для паглыбленага даследавання беларуска-літоўскага і беларуска-польскага моўнага кантактавання, крыніцай далейшага вывучэння гісторыі і дыялекталогіі беларускай мовы. У слоўніку прыведзены паралелі з іншых славянскіх і неславянскіх моў, якія ўказваюць на шляхі пранікнення лексікі ў беларускія гаворкі. Гэты слоўнік пакуль што – самы большы з усіх беларускіх дыялектных слоўнікаў, якія выйшлі з друку, па колькасці пададзеных і растлумачаных у ім слоў – 38 тыс.слоў.



З пачатку 60-х гадоў супрацоўнікамі сектара дыялекталогіі пачалося збіранне беларускіх дыялектных матэрыялаў для складання Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа.

У 70-я гады ХХ ст. пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН Беларусі Ю.Ф. Мацкевіч была распрацавана спецыяльная праграма для стварэння Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак і пачалася экспедыцыйная праца па збіранні фактычнага матэрыялу для яго. У 1993 – 1998 гг. гэта фундаментальная пяцітомная навуковая работа выйшла з друку. Першы і другі тамы атласа выйшлі пад рэдакцыяй М. В. Бірылы і Ю.Ф. Мацкевіч, а трэці, чацвёрты і пяты пад рэдакцыяй Ю.Ф.Мацкевіч. Атлас змяшчае 1791 лінгвістычную карту, на якіх пракартаграфаваны вялікі лексічны, семантычны, словаўтваральны і акцэнталагічны матэрыял. У працы пракаментавана кожнае слова, іншая моўная адзінка, паказана ўсё моўнае багацце беларускіх народных гаворак, іх тэрытарыяльнае распаўсюджанне і асаблівасці ўжывання.

Гэта ўнікальная праца высока ацэнена навуковай грамадскасцю свету, а яе асноўныя выканаўцы Ю. Ф. Мацкевіч, Ф.Д.Клімчук, С.Г. Лобач, Я. М. Рамановіч, А. І. Чабярук і Я. І. Яшкін уганараваны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь за 2000 г. Вялікім гонарам для спецыялістаў-мовазнаўцаў Беларусі з'яўляецца тое, што больш ні ў аднаго славянскага народа няма пакуль што такіх фундаментальных, унікальных прац, якімі ў беларусаў з'яўляецца "Дыялекталагічны атлас беларускай мовы" (1963; у дзвюх кнігах) і пяцітомны "Лексічны атлас беларускіх народных гаворак" (1993-1998).

Акрамя названага, Ю.Ф. Мацкевіч асабіста напісала каля 100 навуковых прац, прысвечаных розным пытанням беларускай дыялекталогіі, беларуска-іншамоўнага кантактавання, моўнаму майстэрству пісьменніка (у прыватнасці, Янкі Купалы) і інш.

Апошнія дзесяцігоддзі ў сектары дыялекталогіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, якім кіравала Ю.Ф. Мацкевіч, падрыхтаваны і выдадзены пяцітомны "Тураўскі слоўнік", шэсць зборнікаў матэрыялаў народна-дыялектнай лексікі і фразеалогіі. Паспяхова працавалі вучоныя сектара над такімі важнымі тэмамі, як "Агульнаславянскі лінгвістычны атлас", "Лінгвістычны атлас Еўропы" і інш.

Юзэфа Фларыянаўна прапрацавала ў Акадэміі навук да свайго 80-гадовага ўзросту, але і пазней. Выйшаўшы на пенсію, працягвала і працягвае быць творча актыўнай. Да гэтага часу працягваюць выходзіць з друку як яе індывідуальныя, так і створаныя ёй разам з калектывам навуковыя працы. Яе навуковыя ідэі праводзяць у жыццё цяпер яе шматлікія вучні і калегі.

Ю. Ф. Мацкевіч – не кабінетны вучоны. Не было ніводнага года, калі яна працавала ў АН, каб яна не выязджала ў дыялекталагічныя экспедыцыі. Яна абхадзіла і аб'ездзіла ўсю Беларусь, тэрыторыю Латвіі і Літвы, дзе ёсць беларускія гаворкі, абследавала не адну сотню населеных пунктаў.

Як буйнейшы спецыяліст у галіне беларускага мовазнаўства, ініцыятыўны арганізатар навукова-даследчай работы і аўтар шматлікіх грунтоўных прац доктар філалагічных навук Ю. Ф. Мацкевіч у 1969 г. першай з супрацоўнікаў Інстытута мовазнаўства ў пасляваенны час выбрана членам-карэспандэнтам АН Беларусі.

Навуковая і навукова-арганізатарская дзейнасць члена-карэспандэнта Ю. Ф. Мацкевіч высока ацэнена ўрадам. У 1978 г. ёй прысвоена ганаровае званне "Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР". Яна ўзнагароджана ордэнам "Дружбы народаў", медалямі "За доблесную працу", "Ветэран працы" і Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Ю. Ф. Мацкевіч на працягу доўгіх гадоў з'яўлялася членам навуковага каардынацыйнага савета па праблемах беларускага і рускага мовазнаўства, на працягу дванаццаці гадоў з'яўлялася членам рэдакцыйнай калегіі штогодніка "Беларуская лінгвістыка", дзесяцігоддзямі была членам спецыялізаванага савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый пры Інстытуце мовазнаўства НАН Беларусі.

Вялікім аўтарытэтам карыстаецца Юзэфа Фларыянаўна Мацкевіч ў калектыве Інстытута мовазнаўства, сярод мовазнаўцаў Рэспублікі Беларусь, краін СНД, Літвы, Польшчы, іншых славянскіх краін. Сціпласць, добрасумленнасць, вялікая працалюбівасць, падзвіжніцкая адданасць навуцы – вось тыя якасці, якімі валодае яна спаўна.

Вучні і калегі дарагой Юзэфы Фларыянаўны віншуюць яе з нядаўнім прысваеннем ёй Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і з шаноўным 90-гадовым юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, чакаюць ад яе новых навуковых ідэй і прапаноў па вывучэнні пытанняў роднай мовы, якім яна сама прысвяціла ўсё сваё жыццё.

Мікалай Крыўко,
вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай АН Беларусі.



Літаратурная старонка "Нашага слова"

Бычкова Юля

Пакліч за сабоюй у жыццёвую цемру
Ці дзверы ўрасчын пакінь.
Пакліч за сабой і тады я паверу –
Я твой неблагі ўспамін.
Пакліч за сабой у зеляноту лясную,
У журботу прыціхлых палёў,
Пакліч за сабой, калі я засумую
Пад стомлены гул цягнікоў.
Пакліч за сабой і навыдбег сустрэньма
Сярод незнаёмых людзей.
Пакліч за сабой, назаўсёды павер мне –
Не згубіш ніводнай з надзей.
Атруціць цябе я не маю намеру,
Як шэры салодкі палын,
Пакліч за сабой у жыццёвую цемру
І дзверы ўрасчын пакінь.

x x x

Пустэчы гук – каханне – на стале
І ў люстэрку – зморанья цені,
Галлё, адзетае ў шэрань,
І сэрца, што працягвае балець.
Малюе адзінота ланцугом
Незразумелы позірк на імгненне
І гэтае тваё неразуменне
Маіх знадворкавых шляхоў.

Арцём Арашонак

Дагарае свечкай Венера
Над прыгожым і сонным сялом.
Льецца водар азёрны аеру
Пад празрыста-туманным святлом.

Вольны вецер ля рэчкі блукае,
Б'е нясмела ў дзверы хлявоў.
І жніво залацістае грае
Пад мелодыі белых буслоў.

X X X

Добры дзень, мой родны край,
Вёскі шэрыя і хаты.
Грай, гармонік, міла грай,
Для Радзімы, як на свята.

Не шкадуй чароўных слоў
Для бадзёрай, гучнай песні,
Каб ад тысячы званоў
Духам слабыя ўваскрэслі.

X X X

Вось Радзіма, Айчына мая,
Тры бярозы-сяброўкі ля рэчкі.
Вабіць водарам кветак зямля,
Цёплым дымам запаленай печкі.

Месяц жоўты над вёскай плыве
Па суквеццях чароўных язміну.
І, як зорка, у сэрцы жыве
Сінявокая маці-краіна.

Пагоня

Ты – гонар Айчыны,
Ты – сімвал народны
Ляціш праз краіну
Па шляху свабоды.

У срэбры стагоддзяў
Наш дух абуджаеш,
Уздымаеш паходні
Над бацькавым краем.

Табе досыць гнёту,
Чужынцаў і катаў.
Імкнешся на волю
З нявольніцкіх кратаў.

Георг Шэўмер

Ланцугамі падзямелляў
Закавалі вольны дух,
Спавілі халоднай цемрай,
Каб між кратаў ён затух.

За дзвярыма казематаў
Зграя выкармленых псоў
На ўвесь свет вурчыць заўзята
За зацірку з атрубоў.

Да гаротных стогнаў глухі.
Сэрцы іх паўздоўж муроў...
І гатовы ўпасці рукі,
І халодзяць думкі кроў...

Ўсё імкнецца чорны колер
Над зямлёю пахаваць,
Ўсё пазбавіць ў свеце волі
Дух свабоды запужаць.

Толькі ён не разумее
Ў той упартасці сваёй:
Плынь заўжды ў той час мялее,
Калі шырыць бераг свой.

І ўсё болей разумення
Пад цяжкіх часоў пятой,
Што патрэбна вызваленне
З замарокі нажытой.

І... прыходзіць прабуджэнне
Ад заўзятасці сляпой
Калі ўжо няспынным брэхам
Не ўтрымаць начы былой.

г. Менск.

ДРЭМЛЕ КЛЁН БАРВОВЫ

Дрэмле клён барвовы,
Чуць калыша вецце.
І зрывае з кронаў
Ліст пажоўклы вецер.

Я і сам, як клён той,
Што апала лісце,
Не магу і ўпотай
Пагуляць дзе, выйсці.

Я ляжу ў бальніцы –
Эх, падняцца б крышку!
Хмурая сястрыца
Лье мікстуру ў лыжку.

Носіць лекі часта.
Коле мяне шпрыцам.
Ноччу месяц ясны
У вакно глядзіцца.

А вокал зіяюць
Зоркі чарадою,
Мо, мяне чакаюць.

Каб забраць з сабою?

Анатоль Курыльчык.

БЕЛАРУСЬ МАЯ

"Беларусь – мая мова і песня..."
Рыгор Барадулін

Беларусь – мая мова і песня,
Беларусь – мая песня і мова,
Што магу сваім чынам ці словам
Для Цябе, дарагая, здзейсніць?

Былі людзі – галовы складалі
За Цябе, тваю роўнасць і волю,
Здрады ў сэрцах не мелі ніколі,
Хоць за тое ў гулагах каналі.

Я – ж адно аддаваў – так нямнога –
Безкарысную доўгую працу,
Меў на ласку Тваю спадзявацца,
Ты даруй мне віну, дзеля Бога!

Вер, адзіная Ты, я гатовы
Усё, што маю, у ахвяру прынесці,
Беларусь, мая мова і песня,
Беларусь, мая песня і мова.

Р. Ладаховіч-Тамілін.
2001, студзень, 22.

Таццяна КІРЫЛЕНКА

***

Каму патрэбен той народ,
Які сваё сваім не лічыць,
Ад белых слоў вароціць лычык
І гоніць сам сябе за дрот?

Каму патрэбен той народ,
Якому ўсё сваё абрыдла,
Хто просіць "драць" яго, як быдла,
Цацанкі сніць, раскрыўшы рот?..

Каму патрэбен той народ,
Што голасу свайго не мае,
Суседзяў звычкі пераймае,
Да панскіх ног – як ласы кот?..

Каму патрэбен той народ,
Якога ўжо няма амаль што
(Улік галоў: спадніца-гальштук
І свята цела ў Новы год)?..

Каму патрэбен мой народ?
Хай будзе толькі мне патрэбным
І ў срэбры, і ў бядняцкім зрэб'і,
Бо бруд ракі – і кроплі бруд.

***

Як быццам вымавіць лягчэй
Зламаным языком карценне,
Адкінуць шчыт размоваў-ценяў,
Агнём дыхнуць, што дух пячэ...
Чым крок зрабіць, глыток адмераць,
Спісанай стос спаліць паперы
І знікнуць у нябыт начэй...

ПЕСНЯ

Калі не я, то нехта
Падхопіць родны сцяг.
Як упадзеш на снег ты,
Я рушу па касцях.

Паплечнікаў і катаў,
Заліўшых дол крывёй,
Апошняй бітвай сцятых
За дом, за горад свой.

Бо адчуваць нясцерпна,
Нібыта мы ў гасцях...
Калі не я, то нехта
Падхопіць родны сцяг.

Не будзе прабачэння, -
Наступнік мой, прабач!
Свабоды нараджэнне
Вадой з Дняпра адзнач.

Спяваць не змогне рэха –
Сяброў маіх працяг:
"Калі не я, то нехта
Падхопіць родны сцяг..."

***

За ветрам лячу, за ветрам.
Хапаю рукой паветра.
Згубіцца ў блакітных нетрах
Між пены аблок хачу.

За ветрам лячу, за ветрам.
Гаючыя кіламетры
Цераз нікчэмныя нервы
Па венах гудзець пашчу.

За ветрам лячу, за ветрам.
Над лесам, над белым светам.
Гляджу на сваю планету...
За ветрам сваім лячу...

Янка Карповіч

А на сэрцы-смутак

Шчасце, як маланка,
Успыхнула і згасла,
Сонца толькі зранку
Засвяціла ясна.

Шчасце адляцела
У вырай ранняй птушкай,
Поле апусцела,
Як дарогі-стужкі.

Восень жоўціць травы,
Навявае смутак,
Робіць свае справы
На здзіўленне хутка.

Чырвань заіграла
Ў клёнах ды рабінах
І цяпла не стала
На абшарах мілых.

Гучна з паднябесся
Журавы крычалі,
Край са смутнай песняй,
З жалем пакідалі.

Восень, мая восень,
Адкажы, нарэшце,
Ці ўбачу просінь
Я на белым свеце?

***

На таемным чоўне
Выплывае вечар,
Музыкай чароўнай
Поўніць сэрца вецер.
Салаўінай песняй,
Жыраўліным жалем
Аддаецца ў сэрцы
Паланез адчаю.

Лес

У самоце глядзіш
На пустыя палеткі,
А з нябёс сінява
Льецца чыстай ракой.

Ты сташ і маўчыш,
Зацалованы летам,
Ды ўжо сівер начны
Парушае спакой.

Сцеле вецер тугу
На прасторах радзімы,
Абтрасае лісцё
З намалёваных дрэў.

Усё ж я сэрцам змагу
Цябе, край мой адзіны,
Пранясці праз жыццё
Пад асенні напеў.

Яблынька

Распусціўшы косы –
Дыяменты – росы
Ва ўсёй красе.
Цешым сэрца зранку,
Мілая заранка,
Радасць мне нясеш.

У траўні пабялееш,
Вэлюнам павееш,
Сцежкі замяцеш.
У верасні багаты
Стол накрыеш у хаце
У госці пазавеш.

Вечарам туманным
Прыгажуню панну
Будзем услаўляць.
У ружовыя шчочкі,
Міленькія вочкі
Будзем цалаваць.

Шэльма – ветрык

Шэльма- ветрык жвава
Ладзіць свае справы,
Пеніць і бурліць,
Падымае хвалі,
Раздзімае травы,
Дрэвамі скрыпіць.

Вось прыбег у садочак,
Поруч яблынь-дочак
У танцы пакружыў.
Расчасаўшы косы
Модніцам бярозам,
Ураз заваражыў.

Зранкуу ён у лесе
Лашчыць дрэвы цешыць,
Нізка долу гне.
У жытнёвым полі,
На ўсім прасторы
Песенькі пяе.

Мая Шчара

То павольная, задуменная,
То імклівая, летуценная
Хвалі коціш у даль.
Звоніш красками,
Сцелеш казкаю
Праз лугі белы шаль.

І празрыстая, серабрыстая,
А на золаку залацістая
Цешыш ласкай сваёй.
Думкі стужкаю
Аб табе,
Зямля беларуская,
Поўняць сэрца маё.

Ядзэп Палубятка

АУРАЛЕСІЦА

(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)

Антон Пятровіч Крыніца не быў набожным чалавекам і да гэтага часу ніколі не сумняваўся ў адсутнасці Бога. Для яго было што Бог? што супастат — усяроўна, але прыпёрты, як кажуць людзі, абставінамі, ён вырашыў адступіць ад сваіх строгіх прынцыпаў ваяўнічага атэізму і звярнуцца да гэтага "яснавяльможнага пана" з просьбаю ... Не! Не! З малітваю. Усе ж вернікі звяртаюцца да бога з малітваю. І яму здалося, што Бог у гэты момант забыўся пра голых і босых, пра жабракоў, галодных, халодных, калек, хворых, нават не звяртае ўвагі на папу Рымскага і патрыярха Усея Русі, а слухае толькі яго аднаго: самага няшчаснага, самага гаротнага, бедалагу з бедалаг — Антона Пятровіча Крыніцу. Яму яшчэ здавалася, што яго голас у гэты момант гучыць у вушах Бога значна мацней, чым галасы іншых людзей, якія звяртаюцца да ўсявышняга па дапамогу, абарону, у пошуках справядлівасці, праўды, падтрымкі, аб літасці.

Першы сакратар ураз забыўся пра ўсе свае антырэлігійныя ўчынкі (знішчаныя ў раёне па яго загаду цэрквы, касцёлы, капліцы, спілаваныя на прыдарожных магілах крыжы) і стаў рэлігійным фанатыкам, які пад час малення губляе розум, уваходзіць у экстаз і ўсё зямное ды грэшнае для яго не існуе.

Маліўся ён зацята, ад шчырага сэрца, як бацюшка ў дзень сваёй першай службы ў новым прыходзе.

Маліўся, як умеў. Маліўся, як навучыў яго наш айчынны кінематограф, бо ён, Крыніца, нідзе болей, акрамя кіно, не бачыў, як сапраўды моляцца людзі і ніколі не чуў сапраўдных малітваў, калі не браць да ўвагі яго партыйныя казанні: — Божа! Злітуйся, Божа! Ты ўсё можаш! Усё ва ўладзе Тваёй. Ты ўсё ведаеш. Адкажы, Божа! Калі ўжо нашыя людзі будуць задаволены ўсім, калі іх вантроба будзе пад завязку набіта ежаю, калі яны ўдосталь нацешаць сваю прыхамаць, калі яны перастануць пісаць скаргі, даносы, узводзіць на мяне паклёпы. Божа, адкажы! Я табе за гэта ... бутэльку "Напалеона" пастаўлю. Божа -а! ..

На тым малітва Крыніцы скончылася. Ён змоўк і прыслухаўся. Цішыня. Не чуваць малінавага звону. Не трубяць анёлы свае пераможныя песні ... І Бог маўчыць. Ні гу -гу!

Тады Антон Пятровіч вырашыў паўтарыць сваю малітву яшчэ раз і паўтарыў, а ў канцы паабяцаў падарыць Богу сваю чорную "Волгу".

"Хіба шкада! Усё раўна не новая. Калі застануся першым сакратаром, дык сабе пяць машын здабуду".

Скончыў. Прыслухаўся . Цішыня. Толькі ледзь чутны шоргат і ўсхліп кранулі яго слых. І зноў усё аціхла.

"Беражонага Бог беражэ!" — падумаў пра сябе першы сакратар райкама партыі, злажыў, як нябожчык, рукі на грудзях, заплюшчыў вочы, моцна застагнаў і стаў маліцца далей.

— Калі ўжо мне, беднаму чалавеку, будзе спакой на нашай зямлі. Божа, зрабі так, каб ...

Тут Крыніца заўважыў, што ў палаце ёсць яшчэ нехта. Ён расплюшчыў адно вока і ўважліва паглядзеў. Так і ёсць — чалавек, і даволі дзіўнага выгляду: сівая барада, сівая галава і нешта доўгае накінута на плечы — ці то плашч, ці то балахон.

Хіба добра ўсё разгледзіш адным вокам!

Хто гэты незнаёмец — Бог? У Крыніцы не было ніякага сумнення.

"Гэта маё выратаванне", — узрадаваўся ён і тут жа разгубіўся, бо не ведаў, як трэба звяртацца да самога Бога. Як зваць яго.

Для Антона Пятровіча ўсе людзі былі таварышамі. Называць незнаёмца такім чынам ён усё ж палічыў вялікай рызыкай: можа пакрыўдзіцца. Сказаць Богу "грамадзянін" у Крыніцы не паварочваўся язык. Несур'ёзна. Які ж ён грамадзянін? Ужыць слова "пан" было ніжэй яго партыйнай годнасці. Калі ён сам зрабіўся панам, то з усіх трыбун і на ўсіх нарадах гарлапаніў, што ў нас усе роўныя.

Першае імя, якое ўспомніў Крыніца — Бахус. Добры бог, але не той, які яму патрэбны зараз. Потым успомнілася імя Зеўс, але неразлучнае з ім словаспалучэнне "у старажытнагрэцкай міфалогіі", патушыла агеньчык надзеі. Першы сакратар райкама партыі валодаў вялікімі гістарычнымі ведамі і таму прыпомніў яшчэ Пяруна. Але ўсходнеславянскі паганскі бог адразу страціў яго давер.

У час роздуму Крыніца на некалькі хвілін заплюшчыў вока, але калі расплюшчыў зноў, то ўбачыў, што гэты незямны прывід наблізіўся да яго ... спыніўся ля самага ложка ... стаіць і шморгае, як малое дзіця, носам.

З грудзей першага нечакана вырваўся ўздых.

— О, Божа!

... І цуд! Адбыўся цуд! Бог загаварыў з ім ... Нетаропка, разважна, павучальна. Усё, як належыць усявышняму.

— Ах, цяпер табе Бога падавай, грэшная твая душа!

— Вінаваты ! Вінаваты! Злітуйся!

— Літасці просіш? А шкадаваў ты тых, каго без віны караў...

— Вінаваты ... Але будзь справядлівым, Усявышні, выслухай...

— А ты сам усіх слухаў, да ўсіх быў справядлівы?

— Вінаваты, каюся!

— Ты ўсё сваё жыццё карыстаўся чужою працаю. Абіраў каго толькі мог ...

— Пакінь на былой пасадзе. Усё буду рабіць па справядлівасці. Абяцаю. Прысцябаеў выганю. Усё сваё дабро людзям раздам ...

І ў знак таго, што ўсё сказанае ім будзе здзейсна, Крыніца перавярнуў сумку і ўсё, што знаходзілася ў ёй выпала на падлогу. Бутэлька з армянскім каньяком прыкацілася прама да ног Нічыпара Кузянкова. Ён, як толькі пабачыў бутэльку, адразу забыўся пра патрэбу, з якой прыйшоў да першага сакратара. Вартаўнік-конюх хуценька схапіў яе, і ўжо ніякая сіла не магла прымусіць яго вярнуць падарунак грознага ўладара.

Крыніца працягваў гаварыць. У голасе яго — поўная безнадзейнасць. Але калі ён пабачыў, што невядомая істота падняла з падлогі грэхаводнае і крахаборнае зелле, то сам, не ўстаючы з ложка, дацягнуўся да дзікавага кумпяка, які ляжаў побач, падняў яго і падаў.

— Вазьмі ... Вазьмі ды раздай галодным і жабракам ... Скажы ... Усім скажы, што Антон Крыніца нічога для людзей не шкадуе ... Ён апошняе аддасць ім ...

Незямны прывід узяў кумпяк, але далей стаў паводзіць сябе, як самы звычайны чалавек: знік і не прамовіў ні слова.

Калі Крыніца скончыў гаворку і на хвіліну да яго вярнулася свядомасць, то ён убачыў раскіданыя па палаце свае рэчы, абглыданую качку, дзве пустыя бутэлькі, каўбасу.

"Усе адвярнуліся ад мяне!"

Ад гэтай думкі яму зноў стала блага.

Няма на гэтай зямлі паратунку Крыніцы. Ніхто не заступіўся за яго, ніхто не працягнуў яму рукі дапамогі. Не быць яму болей першым сакратаром райкама партыі. Не быць — а так хочацца, і ўраз ён адчуў, што яго жыццё згубіла ўсякі сэнс. Страчана такая пасада — і няма чаго жыць далей!

Ён сёння ўжо другі раз — цяпер канчаткова і беспаваротна — злажыў рукі на грудзях і без стогнаў, без вокання, без цяжкіх фізічных мук адышоў у іншы свет з вялікаю надзеяю на светлае начальніцкае жыццё там, у раі, і на пасмяротную рэабілітацыю з абавязковай пастаноўкай помніка тут, на гэтай грэшнай зямлі, якая расцвіла на яго садовым ўчастку, і то дзякуючы вялікім намаганням хаўруснікаў.

XVII

Доктар Астапчык закончыў пісаць гісторыю хваробы зусім здаровага чалавека, паклаў на стол ручку і на хвіліну расслабіўся: справа зроблена. Зроблена чыста — ніхто не падкапаецца. Упершыню ў сваім жыцці Сяргей Астапчык разважаў практычна: "Я прымушу яго стрымаць абяцанне. Усё ў маіх руках ..." Каб адчуць, што гэта іменна так, ён, нават, сціснуў пальцы ў кулакі. Атрымалася вельмі добра і сам сабе Сяргей, нібы вопытны капітан, дадаў: "Так трымаць".

Заставалася толькі адна дробязь — устаць і занесці амбулаторную картку ў аддзяленне, дзе ёй і належала быць.

Гэтаму маленькаму ўчынку не суджана было здзейсніцца. У пакой зноў ўварваўся галоўны ўрач райбальніцы. Ён меў раз'юшаны выгляд, але па яго паводзінах было відаць, што ён на хвіліну разгубіўся. Кабінет, у якім урач Астапчык прымаў хворых, быў з паўночнага боку, і таму сюды ніколі не заглядвала сонца, а пры выключаным асвятленні тут заўжды было шэра. Чорныя акуляры зусім засланялі Улановічу святло, і каб што-небудзь пабачыць, прыйшлося зняць іх.

Спарцмен быў добрым мастаком. Партрэт Улановічу ён "размаляваў удала": чырвоныя ад крыві вочкі-зоркі мелі вельмі страшны выгляд. Яго позірк напамінаў позірк людаеда, які назіраў за сваёю ахвяраю з цёмнай пячоры.

Сяргей Астапчык адразу зразумеў, што яго зараз не проста будуць трэсці, а будуць біць і, магчыма, яго галавою прабаваць на моц мураваныя сцены. Медыцынская сястра таксама мела такую думку і таму хуценька падбегла да шкляной шафы і ўшчарэпілася за яе абедзвюма рукамі.

Доктар схапіў са стала картку і падаў свайму грознаму начальніку, каб хоць неяк зменшыць яго гнеў.

— Усё гатова. Усё напісана.

Галоўны ўрач чамусьці не ўзрадаваўся такой пунктуальнасці свайго падначаленага, а наадварот, яшчэ болей раззлаваўся. Ён выхапіў з рук Астапчыка амбулаторную картку, нават не зазірнуў у яе, а адразу разарваў на дробныя кавалачкі, шпурнуў іх на падлогу і стаў таптаць нагамі. Таптаўся доўга, радасна, з істэрычным натхненнем, быццам тыя паперкі маглі прынесці яму вялікую бяду, гора ці страшнае няшчасце. Гэта была асабістая помста галоўнага ўрача райбальніцы Улановіча першаму сакратару райкама партыі Крыніцы.

Рытуальны танец абарыгена з Малых Антыльскіх астравоў у выкананні Сцяпана Сцяпанавіча Улановіча працягваўся не менш пяці хвілін. Ад шалёных скокаў ён прытаміўся, упрэў, а гнеў яго зменшыўся. Трэсці свайго падначаленага галоўны ўрач не стаў, але тым не менш выгаварыўся:

— Ты мне болей такім глупствам не займайся. Паглядзі, колькі да цябе хворых прыйшло. Ты ж клятву Гіпакрата даваў, Кляўся, што будзеш дапамагаць ім. А ты? .. Ты забыў гэтыя святыя словы і дзеля выратавання прахвоста ды злодзея сядзіш тут, марнуеш час і псуеш паперу. У -у! .. Глядзі у мяне! — і для большага выхаваўчага эфекту патрос яшчэ кулаком.

Галаўны урач райбальніцы павесіў на нос акуляры і выйшаў.

Хірург Астапчык нарэшце пачаў прыём хворых.

Хворых сапраўды было шмат, але пяць гадоў урачэбнай практыкі навучылі доктара з першага позірку вызначаць, што трэба хвораму: бюлетэнь, лекі, парада ці проста доктар.

... І прыём пайшоў хутка. Хворыя са стосамі рэцэптаў на руках у адно імгненне выходзілі ад доктара, а наўздагон ім чулася патрабавальнае:

- Наступны ... наступны... наступны...

У час прыёму з доктарам пачало твaрыцца нешта неверагоднае і дзіўнае. Ён раптам пачаў спяваць: не тое каб мармытаць сабе пад нос, як гэта робяць іншыя людзі, калі маюць цудоўны настрой. Не! У доктара быў кепскі настрой ды спяваў ён гучна, амаль што крычаў ... Праспявае ён так "Калінку" ад пачатку і да канца, затым старой бабцы пракукарэкаў, як курыца на бяду, "Вочы чорныя", і жанчына пачала падпяваць яму. Пасля зацягнуў пра Сценьку Разіна, які ўтапіў княгіню пасля таго, як пераспаў з ёю ноч: ці то не спадабалася яна яму, ці то век такі быў і норавы дзікія — разбярыся паспрабуй без пляшкі гарэлкі. Сумная вельмі песня і, магчыма, таму доктар спяваць яе да канца не стаў, а пачаў распавядаць анекдоты. Усе анекдоты былі прафесійнымі. Гледзячы на адну бабулю, ён зусім сур'ёзна запытаў у медсястры: "Лячыць будзем ці няхай жыве?" Васьмідзесяцігадовая жанчына не зразумела гумару, а хуценька выйшла з кабінета. Яна яшчэ столькі пражыць марыла. Другая бабка, наадварот, хацела, каб гэты вясёлы доктар пацешыў яе яшчэ чым-небудзь — прыйшлося выпіхваць бабку за дзверы. Адну маладую дзяўчыну, якая парэзала нагу, ён пагладзіў за калена і крыху вышэй, затым ушчыпнуў за бок і гарэзліва падмігнуў. Дзяўчыне вельмі спадабаўся прыгожы і вясёлы доктар, і яна пашкадавала, што не параніла другую нагу, бо тады доктар, напэўна, пагладзіў бы за другое калена і вышэй, ушчыпнуў бы за другі бок ды падмігнуў бы яшчэ раз.

" Які цудоўны гэты сімпацяга - доктар!"

Другая дзяўчына, у якой была паранена рука, не зразумела жартаў Астапчыка і здароваю рукою, што было сілы адвесіла яму аплявуху.

Медсястра падазрона стала глядзець на доктара. Ён ніколі не быў такім: заўжды сур'ёзны, стрыманы, ветлівы.

Апошнімі ў доўгай чарзе хворых і сімулянтаў былі два пацыенты: муж Наташы Галавач і муж Кацярыны Макейчык. Яны ўвайшлі ўдвух і спыніліся, як толькі пераступілі парог, нібы сваты перад першай бэлькай у хаце маладой.

— Слухаю вас, — сказаў доктар, бо пацыенты маўчалі.

Вясёласць у яго знікла, а на яе месца прыйшоў страх. Яму здалося, што яго намер сустрэцца сягоння з Наташаю выкрыўся, і муж Наташы са сваім сябруком завітаў сюды дзеля таго, каб пасквітацца з ім.

Людзі, якія ўвайшлі, працягвалі маўчаць і сарамліва зыркалі то адзін на аднаго, то на доктара: ад гэтага страх у доктара толькі ўзмацняўся.

— Ну, слухаю вас. Слухаю.

— Мая жонка, Наташа, была у вас на прыёме і ...

Астапчыку здалося, што яго абдалі кіпнем і зараз кінуць у паломку з ледзяною вадою. Муж Наташы Галавач на хвіліну змоўк, і ў пакоі на хвіліну ўсталявалася немая цішыня, толькі доктар, нібы галодны воўк, клацаў зубамі.

— І мая жонка, Кацярына, была у вас на прыёме...

Астапчык заклацаў зубамі яшчэ мацней.

— ... яны казалі, што вы добры чалавек.

— ... казалі - казалі.

У доктара пачала трэсціся галава.

— Шаноўны доктар, — гаварыў муж Кацярыны Макейчык, які пазычаў Астапчыку капейкі. — Вы добры чалавек! .. У нас медагляд. Падпішыце нам амбулаторныя карткі.

— Па - дыдзі -це блі -жэй.

Мужчыны падышлі да стала і падалі доктару свае амбулаторныя карткі, упэўненыя, што той іх падпіша. Церпкі пах, які ішоў ад іх, вярнуў Астапчыку свядомасць, і яму сапраўды захацелася хутчэй пазбавіцца ад надаядных пацыентаў.

Зазваніў тэлефон, па якім ён, Астапчык, у прысутнасці медсястры вёў толькі службовыя размовы.

Званіла Наташа. Голас яе быў суровы і ўзбуджаны.

— Так, значыць, вы сягоння на спатканне сабраліся? — пачала яна размову без усякага ўступу.

— Што-небудзь здарылася? — Астапчык быў падобны на малое дзіцё, якое нават не ведае пра сваю правіннасць перад дарослымі.

— Нічога не здарылася. Усё нармальна, — адчувалася, што жанчына вось-вось заплача.

— Ты не маеш магчымасці прыйсці?

— Вядома, маю. Але мяне ніхто не кліча .. Я нікому не патрэбная-я, — у трубцы пачуўся ўсхліп.

— Я ж табе тэлефанаваў! Я ж цябе клікаў!

Далей Наташа гаварыла скрозь слёзы:

— Табе прыснілася. Ты Кацюньцы званіў. Гэтай дурніцы, а не мне. Гэта ты ёй прызначыў спатканне...

(Працяг у наступным нумары.)

Мікола Грышан

Абрабаванне сярод белага дня

(Апавяданне)

Мая мама часта прыгаворвала:

- Пагодзе не загадаеш, пагоду не ўгадаеш.

І гэта праўда.

А сёлетні год быў не без прыгод. Рана вясна прыйшла ў наш край. Першага сакавіка ні кроплі снегу на палях, а к абеду на бярозе над хатай Сяргея Рыбака з'явіліся шпакі. Хутка зазеленела трава, раней больш як на паўмесяца людзі выйшлі ў поле. У канцы мая заквітнела бульба, а ў пачатку чэрвеня ляснуў мароз да сямі градусаў, які і падкасіў бульбяныя букеты, Дасталося, акрамя бульбы і ўсяму на палях і агародах. Але бульбе найбольш. Асабліва ноч з 5-га на 6-га чэрвеня была лютай. А раніцай, пакуль мароз не зышоў, трымаліся бульбяныя сцяблінкі, толькі колер свой звыклы страцілі, а пасля дзесяці гадзін, звялі і апалі і кветкі, і лісце, толькі пачарнелыя стрымбулікі тырчалі. Страшна было глядзець на іх, але што зробіш. Усе мы пад Богам ходзім. Хутка бульба ажыла, і ў сярэдзіне лета лашчыла вока людское сваім выглядам.

Помніцца: летам, у нядзелю, выйшлі камбайны жаць недаспелую пшаніцу

- Хто дазволіў такое марнатраўства? – пыталіся людзі.

- Галоўны аграном загадаў, - адзіны быў адказ. Можа таму аграному цюкнула ў мазгі: пасля жыта жаць зялёную пшаніцу. У тую ж нядзелю, пасля абеду, лінуў дождж, а пасля навальніца страшная. І так цэлы тыдзень. На нізкіх месцах усё змарнавалася ды і на высокіх бяда была. Спляжыла недажатыя палеткі. У разорах, а то і суцэльнымі палосамі стаяла вада аж да паловы восені. Сажалкі – і ўсё. Бульбу з тых месц не ўдалося дастаць, яна там згніла. Абязджалі тыя мясціны камбайнеры і трактарысты. Было такое не толькі на калгасных палетках а і на людскіх палосках. У многіх паграбы і бульбяныя ямы аказаліся напалову і болей пустымі.

Не паспелі людзі ўхапіць з поля бульбу, як выпаў снег, які пакрыў цэльнай коўдрай зямлю. Праляжаў ён два дні, а на трэці да абеду і следу яго не засталося. Ярка і прыветна засвяціла сонейка, паплыла ў паветры павуціна – прыкмета бабінага лета.

Апоўдні з тэчкай пад пахаю павольнаю хадою са школы, што месцілася на тым канцы вёскі, дзе стаяў спіртзавод, крочыць яе дырэктар Карп Іван Іванавіч. Якая там школа. Аднакамплектная пачатковая школа з пятнаццаццю вучнямі. Для яго дарога ад школы да дому даўжынёй у паўтара кіламетры была вядомая, як табліца множання. Кожны каменьчык, кожная ўпадзіна за дваццаць пяць гадоў былі абтупаны безліч разоў. Завяжы яму вочы, закруці на адной назе дзесяць разоў і пусці – і ён чуць не па адной лініі з дому да школы і назад трапіць. Вуліца ў вёсцы брукаваная яшчэ да першых саветаў. Такая людская была: цэлы дзень хай лье дождж, хопіць паўгадзіны пагоды і яна сухая. Праўда апошнім часам пакаверкалі яе, як і жыццё людское. У прыродзе існуе ўзаемасувязь паміж яе рознымі відамі і формамі. І ўсё пачынаецца ад самага вышэйшага, удасканаленага ці нават пераўдасканаленага яе віду – чалавека, які і сябе не аберагае, калечыць і ўсё навакол губіць, знішчае.

Пад час манеўраў танкі ямы гусеніцамі павырывалі. Глядзеў Іван Іванавіч на такое дзікунства, а сэрца крывёю аблівалася. А што зробіш? Не перагародзіш вуліцу, не станеш на сярэдзіне яе з расстаўленымі рукамі насупраць танку. І адзін не станеш, і ўдваіх не станеш, і цэлай вёскай таксама. Вунь у Валоўніках у час манеўраў хлопец выйшаў у сад, прытуліўся да яблыні, як наляцеў тут танк і нагу па калена аддушыў. Танкіст-вадзіцель заснуў, а танк на закругленні паляцеў проста ў сад на чалавека. Каб не яблыня, то і хату разбурыў бы.

І надумаўся Іван Іванавіч запісваць нумары танкаў і аўтамашын, а пасля, запыніўшы легкавушку, прад'явіў якомусьці палкоўніку патрабаванне прывесці вуліцу ў належны від, вымасціць камянямі. Во спіс нумароў вашых машын.

- Што?! Ты нумары запісваў! Хто табе дазволіў? У Амерыку перадаць надумаешся свой спісак! У асобы аддзел захацеў! Там табе такую дарожку вымасцяць – раве палкоўнік, не даючы магчымасці і слова сказаць у апраўданне.

Не на жарт перапужаўся настаўнік, а палкоўнік ляснуў дзверцамі і папёрся. А яміны на вуліцы пяском засыпалі.

Ідзе Іван Іванавіч з працы ў звыклым настроі. А тут каля брыгаднай канторы, ці, як людзі гавораць "вугалка", стаіць грузавая машына. Іван Іванавіч абмінае яе і чуе:

- Гэй, педагог, і зайсці не хочаш! Да цябе ў госці прыехалі – прымай – крычыць праз адчыненае акно ветэрынар Торбач.

- Які ты мне госць? – падумаў Іван Іванавіч, але, абмінуўшы машыну, пераходзіць на другі бок вуліцы і кіруе да брамкі. З канторы на ганак выходзяць Торбач, партсакратар саўгаса Чапля, старшыня сельсавета рабаваты Кулік і брыгадзір Вяроўчык. Ніхто з іх не п'яны, хоць працоўны дзень падходзіць да заканчэння. Значыць, яшчэ збіраюцца, будзе п'янка, ды не абы-якая, сабраліся такія, што ім адно падай. Аднаму толькі Торбачу, каб у галаве зашумела, з літар у чэрава трэба ўбабэхаць. Граміла, вялікан, два метры з гакам росту.

- І куды гэта іх нясе? – падумалася Карпу.

- Слухай, агітатар, парторг не задаволены табою: даўно абнаўляў баявы лісток, - не супакойваецца Торбач. – Не даносіш слова партыі да людзей.

- Змоўкні ты, дай з чалавекам павітацца – перабівае ветэрынара рабаваты Кулік, - нават слова сказаць не толькі партыйнае, як ты гаворыш, але і чалавечае, не дасі сказаць.

- То ў вас партыйнае слова не чалавечае, а можа якое сабачае, - у думках усміхаецца Кулік. – Эге, то ў вас нейкі хаос: адзін насядае, другі апраўдвае. Вам не я патрэбен.

- Ды я вось зрабіў накід гутаркі па Бліжняму Усходу. Чакаю брыгаднага сходу, - вітаючыся з кожным за руку, ці то паведамляе, ці то апраўдваецца за ўпушчэнне ў агітацыйнай рабоце Іван Іванавіч.

Усе накіраваліся да машыны. Першым крочыць брыгадзір Вяроўчык, ён адчыняе дзверцы кабіны, залазіць у яе. За руль садзіцца партыйны сакратар Чапля. Астатнія, Торбач і Кулік, палезлі ў кузаў. Іван Іванавіч, не ведаючы, што яму рабіць, застаецца ў варотах.

- А ты што там мнешся, як мядзведзь у клетцы, давай залазь, паедзем партыйнае мерапрыемства праводзіць, - нібы з паддзеўкай прамовіў Кулік.

- Валі да кампаніі, нам весялей будзе, - запрашае Чапля.

На машыне засмяяліся.

Іван Іванавіч нехаця лезе ў кузаў, прадчуваючы штосьці нядобрае.

Машына, праехаўшы вясковую вуліцу, у канцы вёскі паварочвае направа і выязджае на брукаваннку, пракладзеную на пачатку 30-х гадоў. у 1932-34 гадах па ёй хадзіў аўтобус са Слоніма ў Навагрудак. Аўтобус належаў дзвюм сёстрам са Слоніма, якія нанялі шафёра, які штодзённа выконваў па рэйсу ў два бакі.

На аддаленні двух кіламетраў ад вёскі з левага боку быў лясок, туды вяла не шырокая дарога, на якую з'язджае машына.

Ля кабіны ў кузаве чуць ніжэй верху бартоў была пакладзена дошка. На яе селі Кулік, Торбач і Карп.

Торбач бярэ з рук Івана Іванавіча тэчку, расшпіляе яе, дастае падручнік беларускай мовы для трэцяга класа.

- Бе-ла-рус-кая мова, - па складах чытае ён. – Каму патрэбна твая беларукая мова? Хто на ёй размаўляе? Ды на ёй, як казаў прэзідэнт, думак шырока не выкажаш. Во глядзі, што мне мае свінні даюць, - і пачаў з кожнай кішэні то дзесятку рублёў, то дваццаціпятку даставаць.

Кулік засмяяўся. Засмяяўся і Іван Іванавіч.

- Твая праўда: са свіннямі мудрэй жыць, чым з людзьмі. Але ж гавораць так: з кім павядзешся, ад таго і набярэшся, - гаворыць Карп.

- Што?! – раўнуў Торбач. – Ды я цябе, такога разумніка.. – і запяўся: - у грабу бачыў разам з тваёю моваю!

- Ды яна не толькі мая, а мова маіх і тваіх бацькоў і дзядоў, дзяцей нашых. Пайдзі на магілу свайго бацькі і спытай, колькі разоў пяшком разам з маім бацькам у 39-м годзе восенню ў Гарадзішча схадзілі, каб адкрыць у нашай вёсцы сямігодку. Спытай у сваіх дачок, ці патрэбна была ім наша, гэта значыць, мая, а не твая свінячая мова для набыцця ім вышэйшай адукацыі. Чаго маўчыш? Адняло мову? То хутка зарохкаеш можа, так шырэй і дасканалей думкі выкажаш. Адно рохні, як папоўняцца кішэні грашыма.

Торбача ажно перасмыкнула. Кулік маўчаў, ён паглядаў то на аднаго, то на другога.

- А што з табою гаварыць, - махнуў рукою Торбач. – Лепш памаўчаць.

- Даўно пара, - адказаў Іван Іванавіч, ён адвярнуўся і стаў глядзець на лес.

За лесам раскінулася Шарэтнікава даліна, даволі вялікі роўны абшар поля, на якой сёлета была пасаджана бульба. Калісьці там быў хутар, і жыў на ім панскі ляснік, які на пачатку вайны прапаў. Жонка казала, што ноччу пастукалі ў акно, клікалі "хазяіна". І ён у хату не вярнуўся. У хуткім часе жанчына адгэтуль выбралася, дом пуставаў, а пасля вайны яго перавезлі ў суседнюю вёску пад школу, але і па сёння тое месца выдавала, што тут калісьці быў абжыты куток. На пачатку калгасаў брыгадзір выкарчаваў сад.

Сёння Шарэйкавая даліна – абшырная роўнядзь чуць не з сотню гектараў, і сёлета частка яе была занята бульбаю, якую выбралі за тыдзень да снегу. Раней яе тут выбіралі камбайнамі, а сёлета яе выбіралі вучні сярэдняй школы, што месціцца на цэнтральнай сядзібе калгаса, і навучэнцы СПТВ, якіх у народзе празвалі хап-зайцамі. Палова ўраджаю засталася на полі, і людзі, у асноўным жанчыны з бліжэйшых вёсак, перадзябвалі палетак. За паўдня накопвалі да трох мяшкоў.

Вось і сёння даліна жыла, варушылася. Звон дзябак, смех жанчын трымаўся ў паветры над полем. Усе ўвіхаліся. Было каля чатырох гадзін пасля абеду. Хутка вечар. Мяшкі радамі, як вартавыя, стаялі па-за жанчынамі. Машына, як драпежны звер, падвываючы паўзла да капальніц. А тыя не звярталі на яе ніякай увагі, не разгінаючыся, працавалі. Лішнія тры мяшкі бульбы ў гаспадарцы таксама нешта значаць. А за чатыры – пяць дзён колькі яе прыбудзе ў пограбе.

Пад'ехаўшы да першых мяшкоў, машына спынілася і з яе саскочылі Кулік і Торбач, з кабіны вылез Вяроўчык. Іван Іванавіч таксама саскочыў з кузава. Чапля застаўся за рулём, ён матор не заглушыў. Кулік і Торбач падбягаюць да бліжняга мяха, завязваюць яго, хапаюць адзін за рог, другі за завязку і кідаюць у кузаў. А Вяроўчык кліча Івана Іванавіча на падмогу, але той не рухаецца з месца, яго нібы паралізавала. Да яго толькі цяпер дайшоў сэнс паездкі. Вяроўчык абхоплівае рукамі мех і прэ яго перад сабою. А на машыну узапхнуць не можа, чырванее ад натугі, сіпіць:

- Ну дапамажы хоць чуць чаго стаіш, як слуп. Карп плюнуў і адышоўся ад машыны.

- Падушыцеся вы тут з гэтаю бульбаю, - толькі і сказаў, а, агляннуўшыся, буркнуў: - Вось табе і агітацыя і прапаганда палітыкі партыі.

Ужо з дзесятак мяшкоў знесена на машыну, а жанчыны, не аглядаючыся, рыюць зямлю. Першай падняла галаву Гэля Хвалісёва. Глянула і ці то ад перапалоху, ці то ад здзіўлення раскрыла рот, а хоць бы слова сказаць не можа. Стаіць з адкрытым ротам і трасецца. А пасля прарвалася, што можа аж у вёсцы за тры кіламетры, пачулі:

- А, бабачкі, гляньце: хапун! Што ж яны, антыхрысты, робяць! Давайце бараніцца!

Крык быў такім нечаканым, што многія глянулі не на таго хапуна, а Гэлю. Не адразу да іх дайшоў сэнс ляманту.

- Давайце пабяжым!

- Адбяром, не дамо!

- Не дамо!

На бягу крычалі жанчыны, трымаючы дзябкі ў руках.

Гэля першай пайшла ў наступленне:

- Што вам крыві нашай мала, крывасмокі. Напіліся, нажэрліся, бэбахі паразносіла, і вам усё мала!

Брыгадзір схаваўся за машыну. Першым аказаўся Кулік.

- А і ты тут, - накінуўся ён на Гэлю. – Дзе цябе няма. У Лядзінах, помніш, як воўну крала, калі авечак стрыглі.

- І многа ты яе ў мяне знайшоў.

- Дзіва што знойдзе. Ён ведае, дзе шукаць: у трусах.

- Дык пайдзі і ў сваёй жонкі там столькі знойдзеш, - смеючыся кажа маладая кабета Маня Камарова.

- Да сваёй ён не спец. Вось у Алены Спасюцкай як пашукаў, што сыночка знайшоў, выліты, як сам: кучаравы, чорны і з рабаціннем на носе, - дабаўляе Антосева Верка, зграбная маладзіца ў спартыўным касцюме.

- Бабанькі, не шуміце. Вы вінаватыя. Народнае дабро нельга браць аднаму, яно належыць народу. Тое, што вы сёння робіце, злачынства, а злачынства караецца. Так сцвярджае савецкі закон, так вучыць нас партыя, кіраўніком якой у калгасе з'яўляюся я, - гаворыць Чапля.

- Якое яно народнае дабро, - уступае зноў у спрэчку Гэля, - гэта ж каб мароз чуць прыціснуў, то снег не растаў бы, паглядзеў тады б, што было з твайго народнага дабра. У вас ні сам не гам ні другому не дам.

- Самі яны то гам. Вунь Куліку цэлы прычэп бульбы і два прычэпы буракоў з Дудзічаў прыперлі, выгрузілі на двары. Увесь свет бачыў.

- Жонка яго сюды не прыйдзе з дзябкаю, на паню хварэе.

- Чаго трэшся аб машыну бокам? Выйдзі скажы, што няпраўда. Маўчыш, - гукаюць Куліку.

- А пастуха Антона, які гнаў каровы і падняў па дарозе пяць цыбулін, хтосьці, відаць згубіў, несучы з поля, аштрафавалі на 35 рублёў.

Кулік з-за машыны не паказваецца. Недалёка ад натоўпу стаіць Іван Іванавіч і пазірае на дзікую сцэну гвалту і бесчалавечнасці: ён дакарае самога сябе за тое, што звязаўся з гэтымі галаварэзамі.

- Іван Іванавіч, напішыце пра іх у газету, - просяць жанчыны.

- Напішу, абавязкова напішу, - абяцае Карп.

- І ты разам з імі знюхаўся, ну, пачакай, мы табе пакажам, - шыпіць з кабіны машыны Чапля.

Іван Іванавіч, нічога яму не сказаўшы, плюе ў яго бок і накіроўваецца да лесу. У галаве гуло, стукаў у скронях нібы малатком, пульс. Ён выйшаў з лесу на дарогу брукаванку. Тут яго абганяе машына, роўна з бартамі нагружаная мяхамі з бульбай.

- Гэй філосаф, глянь, колькі накапалі, - гукае Торбач.

- На чужое вы аматары, - думае Карп.

Машына скіравала ў вёску, а пасля яна з'явілася ў варотах спіртзавода.

Потым людзі казалі, што за здадзеную бульбу Кулікова кампанія атрымала дзевяць тысяч рублёў.

Любяшоў

Калі мы гаворым пра гісторыю Палесся, то нам, палешукам, усё пра яго цікава, нават украінскае, дзе жывуць такія ж палешукі. Тым больш пра Пінскі павет, які ачольваў цалкам ці часткова 9 сучасных раёнаў, з іх два ўкраінскіх: Зарачнянскі і Любяшоўскі. У апошніх і сёння можна ўбачыць старыя паркі і маёнткі пінскай шляхты. У вёсцы Ненькавічы Зарачнянскага раёна нават захаваўся дом Нелюбовіч-Тукальскіх. Адзін з іх быў калісь мітрапалітам Кіеўскім, другі ў Адама Нарушэвіча рэдактарам яго прац па гісторыі Польшчы, таму мы пінскія краязнаўцы, калі-нікалі ды і заскокваем туды на раварах.

Ніжэй сказанае пра Любяшоў будзе дарэчы і да нашай беларускай гісторыі.

Напэўна, яго галоўнай славутасцю будзе піярская школа, якая тут была пры ВКЛ і ў якой лічылі за гонар вучыцца маладыя шляхцюкі.

Але крышку ністорыі гэтых мясцін.

Нягледзячы на склаўшыся стэрэатып пра непраходныя пінскія балоты і галечу насельніцтва, тут даволі высокая культура: школы, бурсы, калегіюмы, храмы, амаль усіх ватыканскіх ордэнаў, нават камуністаў.

Напрыклад, у 1706 годзе шведы, якія хацелі прайсці на Валынь, вельмі былі здзіўлены багаццем Пінска.

У тыя часы ішло шырокае будаўніцтва магнатамі Вішнявецкімі, Дольскімі замкаў, храмаў, маёнткаў. Апошні з іх і заняўся гэтым на месцы невялікай вёсачкі каля Старога Любяшова, вядомага з 12 стагоддзя. Назваў новабудоўлю Новы Дольск. Землі Ян Кароль Дольскі атрымаў тут у 1684 г. і жадаў збудаваць тут замак. Але пачаў з заснавання калегіі піяраў для дзяцей збяднелай шляхты.

Ужо ў 1693 г. Н. Дольск атрымоўвае статус мястэчка. Ян памірае ў 1695 г. Яго жонка, Ганна з Вішнявецкіх, працягвае справу мужа і фундуе далейшае будаўніцтва. Першапачаткова ў школе знаходзіцца 12 вучняў бясплатным коштам. Пасля яе смерці пачынаюцца супярэчнасці паміж рознымі галінамі роду за Любяшоўскія валоданні: Мнішкі, Сапегі, Агінскія, пакуль у 1754 г. Н. Дольск не быў прададзены за 380000 злотых М. А. Чарнецкаму, каштэляну Брацлаўскаму. Ён пачаў будаваць замак. Да сёння захаваліся стары парк з 300 гадовымі ліпамі і ўнікальная двухпавярховая брама. Ёсць праект на яе аднаўленне.

Касцёл піяраў будаваўся 17 год (1745-1762). Яго афармленне не мела роўных у Літве. Сам Папа рымскі кантраляваў яго будаўніцтва. Распісваў храм тры гады вельмі таленавіты мастак Лукаш Гюгель.

Ні царская Расія, ні кайзераўская Нямеччына, ні цэсарская Аўстрыя не змаглі яго знішчыць, але ў 1969 г. дабраліся да яго мясцовыя антыхрысты. 17 ліпеня ён апошні раз пакланіўся любяшоўцам у страшным выбуху і перастаў існаваць назаўжды.

Ёсць яшчэ жывы у Любяшове кляштар капуцынаў, закладзены 4.02.1757 г.

Аб Любяшоўскай школе піяраў ёсць праца апошняга дырэктара Антонія Мошыньскага: "Хроніка Любешівського колегіуму".

Вялікія страты ўсяму Любяшову былі нанесены шведскім каралём Карлам XII, які зруйнаваў усё: замак, парк, фруктовы сад, фальваркі, навакольныя вёскі. Сад меў назву Венецыя. Быў акопаны шматлікімі каналамі, раслі рэдкія для Еўропы дрэвы.

Да пачатку 19 ст. школа мела 300 вучняў. У пачатку 20 ст. адзін ананімны аўтар пісаў: "Невялічкае захалуснае мястэчка забітага кутка балот палескіх ніколі і нічым не прывярнула б да сябе ўвагі, калі б не цудоўная школа, пабудаваная пры манастыры піярамі". Пры школе было тры бурсы: княжат Вішнявецкіх, князя Чацьвярцінскага і пана Кужанецкага. Быў пансіянат і для адароных дзетак з вельмі багатых сямей, і жылі яны разам з настаўнікамі. У 1754-59г.г. тут вучыўся Т. Касцюшка, праходзілі шляхі паэта і прапаведніка Ежы Цяпінскага, Станіслава Юндзіла – заснавальніка Віленскага батанічнага саду, Казіміра Нарбута – педагога і філосафа, аўтара першага падручніка "Логіка", Мацея Догеля – аўтара "Кодэксу дыпламатычнага Каралеўства Польскага і ВКЛ", Матэвуша Бутрымовіча – падстарасты Пінскага, вельмі многа зрабіўшага для ўпарадкавання Палесся, ураджэнца Ваўкавыскага павету.

Школа піяраў была па ўсіх пытаннях перадавой і выхоўвала нацыянальна свядомую моладзь, што вельмі не падабалася расейскім манархам. Цярпелі яны піяраў да 1834 года, калі і закрылі.

Сам калегіюм захаваўся і сёння займаюць яго раённыя ўстановы і рэдакцыя газеты.

Яшчэ некалькі слоў пра некаторых вучняў, скончыўшых калегіюм.

М. Догель, нарадзіўся ў Лідскім павеце ў дробнашляхецкай сям'і. Школу піяраў закончыў на радзіме, а потым два гады вучыўся яшчэ ў Любяшове і стаў тут настаўнікам, братам-прапаведнікам, адкуль быў узяты выхавацелем сына надворнага літоўскага маршалка Сцыпіёна дэ ля Кампа. Пасля яго смерці, можа нават на грошы ўдавы, Догель едзе паглыбляць веды ў Лейпцыг, Парыж. Вярнуўшыся ў Літву становіцца рэктарам піярскага калегіюму ў Вільні. Сваім коштам заснаваў найлепшую ў той час друкарню ў Літве. Змагаўся супраць засілля езуітаў. Многа працаваў над іншаземнымі крыніцамі, у чым яму дапамагалі канцлер М. Чартарыйскі і падканцлер В. Вадзіцкі. Працу яго па гісторыі працягваў А. Нарушэвіч.

Яшчэ адным вучнем і таксама з родам з Лідчыны быў Ст. Баніфацый Юндзіл, пазней прафесар Віленскай Акадэміі. Пачаў вучобу ён дома ў прыватных настаўнікаў і ксяндза, дзе аваладаў рускай і лацінскай мовамі. Потым вучыўся ў Любяшове. Тут ён становіцца манахам і прысвячае сябе педагагічнай працы. Пазней працуе ў адной з піярскіх школ, а потым у Вільні настаўнікам французскай і нямецкай моваў. Не толькі навучае, але і сам працягвае вучыцца фізіцы, хіміі, філасофіі, дапамагае прафесару Рэгнеру перакладаць працы метадычныя і фізічныя з французскай і італьянскай моў. 24-гадоваму педагогу было даручана кіраваць школай у Шчучыне, дзе ён закладае невялікі батанічны сад. Праз год зноў вяртаецца ў Вільню. Калекцыянуе птушак, выдае апісанне раслінага свету Літвы і салёных крыніц краю. Мала таго, праектаваў устаноўкі па здабычы солі. Прызначаецца віцэ-прафесарам натуральнай гісторыіі ў Акадэміі і зноў едзе ў Еўропу, дзе слухае не толькі лекцыі, але знаёміцца з калекцыямі мінералаў, батанічнымі садамі, руднікамі, металургіяй, а ў Вугоршчыне – ветэрынарнай школай.

Яго "Асновы батанікі" былі рэкамендаваны для выкарыстання ў школах, а аўтар узнагароджаны Аляксандрам I дыямантавым пярсцёнкам.

Заснаваў фонд для збяднелых юнакоў з роду Юндзілаў, а таксама "Газету Віленску", журнал "Бібліяфіл".

А Любяшову дасталося і ад сваіх, і ад чужынцаў. І толькі прырода брала сваё. У "Топографических описаниях Минской губернии" канца 18 стагоддзя чытаем: "Речка Стоход омывает своими водами различные поселения, но красивейшее из всех, без сомнения, есть местечко Новый Дольск".

А. М. Дуброшчскі,
Пінск.

Трэба біць трывогу

Пасля доўгага перапынку наведала сваю родную вёску. Змены вялікія і ў горшы бок. Выраджаецца нацыя, апынулася на дне бруднага балота. Прычына ўсяму – гарэлка. П'юць бязбожна – тыднямі, да бяспамятства, самаробную гарэлку ў якую дабаўляюць дуст, розныя хімікаты і яшчэ бог ведае што, каб хутчэй ачмурэць. Гандаль гарэлкай – асноўны прыбытак і заробак. Гандлююць і маладыя сем'і, каб пражыць і сталыя, каб дапамагчы дзецям і ўнукам, калечачы жыцці другім. Мяне здзіўляе, што гэтым займаюцца веруючыя людзі. Звярталіся і ў раённыя аддзелы міліцыі і да ўчастковых, усё безвынікова. Кажуць, што гандаль самаробнай "барматухай" дазволены ў Беларусі. Так было пры Сталіне, саветах, камуністах. Лягчэй кіраваць чалавекам згубіўшым чалавечы воблік, прыстойнасць і памяць. Таму за апошнія некалькі месяцаў жонка засекла мужыка і зрабіла б гэта з дочкамі, каб яны ў гэты час былі дома, жанчына маладая, былы парторг. Другая, калі людзі каля крыжа адбывалі маёўку, спяшалася дахаты, каб у 7 гадзін вечара адсекчы галаву мужыку. Такому паведамленню ніхто не паверыў, але гэта яна зрабіла. У апошнія выхадныя хавалі маладога чалавека, другі ў рэанімацыі, за бутэлькай высвятлялі адносіны. Зарэзалі сям'ю. Вось такія страшныя рэаліі жыцця. Як вядзецца статыстыка ў міліцыі, ці такія здарэнні хаваюцца? Я аб гэтым распавядала ангельцам, дык гэта ж фільмы жахаў.

Калі хто крыху думае, з'язджаюць на заробкі ў другія краіны. Задумаліся і пенсіянеры аб будучым саюзе з Расеяй, нічога добрага не будзе, бачаць да чаго даведзены калгасы і эканоміка, і як жывуць расейцы ў Расеі. Закончылі школу і нават самыя таленавітыя вучні не спрабуюць паступаць у ВНУ, патрэбныя грошы, блат, знаёмствы. Палі пустуюць. Але ж ёсць і прыемнае – на Сёмуху ў Гярвянецкім касцёле адбыўся фэст, на якім прысутнічаў і выступіў Альгірдас Бразаўскас, біскуп, але ж гэта дзякуючы намаганням літоўцаў. Прамовы казаліся палітоўску, польску і пабеларуску. Лылойцінская бібліятэка сама выпісвае "Наша слова", можа і таму, што мясцовая школа носіць імя беларускага пісьменніка Артура Цяжкога, ён родам з Лылойцяў і пахаваны на Нястанішкіх могілках. Мая братова паведаміла, што Дабраўлянскі парк набудзе статус нацыянальнага. Даўно пара, - там бываў В.Дунін-Марцінкевіч, а таксама, у Путуліне. Мая боль – Варонскі Георгіеўскі касцёл XVIII стагоддзя быў прыстасаваны пад майстэрню сельскагаспадарчай тэхнікі – здаецца пачалі рэстаўраваць.

Прычына, што вёска апынулася на дне – абыякавасць да роднай мовы, ліквідацыя бібліятэк, закрыццё беларускамоўных школ, спачатку ў Гірах, потым у Завельцах, Нястанішках, Палянах. Будынкі знішчаюцца, што можна крадзецца. Пустыя дамы засяляюцца прыезджымі, як мой дзядзька казаў: "Людзьмі з усяго свету".

Трэба помніць і берагчы мінулае для будучыні.

Леакадзія Мілаш,
г. Вільня,
ліпень.

У ноч на Івана Купалу



Варажба ў ноч на Івана Купалу. Удзельніцы фальклёрнай групы "Парачанка" з вёскі Парэчча Акцябрскага раёна Насця Шнырыкава і Святлана Рудакоўская.

Фота Сяргея Халадзіліна, БелТА.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Вадзім Болбас, Міхась Булавацкі, Людміла Дзіцэвіч, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 23. 07. 2001 г.
Наклад 5000 асобнікаў. Замова № 1603.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 274 руб., 3 мес.- 822 руб.
Кошт у розніцу: 70 руб.